Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 КРАСАВІКА 2018 г. ЧАЦВЕР № 74 (28690)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Падарункі ад любімай газеты

СТАР. 13

ЧЫРВОНКА

Чырвоная змена

Як знайсці работу мары?

Калі ведаеш сакрэты прыгажосці

ЛІЧБА ДНЯ

2,8 %

складзе рост ВУП Беларусі ў 2018 годзе па прагнозах Міжнароднага валютнага фонду. Такім чынам, ён палепшыў прагноз па росце беларускай эканомікі. Такія даныя прыводзяцца ў новым аглядзе Фонду «Перспектывы сусветнай эканомікі». Паводле прагнозаў МВФ, у 2019-м ВУП Беларусі вырасце на 2,4 %. Раней аналітыкі Фонду прагназавалі рост ВУП нашай краіны ў 2018 годзе на 0,7 %. Інфляцыя ў 2018 і 2019 гадах, па ацэнцы Міжнароднай арганізацыі, складзе ў Беларусі 6 %.

❍ Тым часам

ВУП ВЫРАС НА 5,1 ПРАЦЭНТА

ВУП Беларусі ў першым квартале 2018 года вырас на 5,1 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

Адпаведная інфармацыя змешчана на афіцыйным сайце Нацыянальнага статыстычнага камітэта. Паводле першай ацэнкі, аб'ём ВУП у бягучых цэнах склаў Br26 млрд, або ў супастаўных цэнах 105,1 % да ўзроўню студзеня — сакавіка 2017 года. Індэкс-дэфлятар ВУП у першым квартале па адносінах да аналагічнага перыяду 2017-га склаў 109,9 %.

Ул. інф.

ISSN 1990 - 763X

ФОРМУЛА МАЛДОВЫ

Фота БелТА.

У ЧОРА самалёт Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі прызямліўся ў Кішынёве — сталіцы Малдовы. Большасць часу першага дня афіцыйнага візіту кіраўніка дзяржавы ў гэту краіну пайшла на перагаворы з яе Прэзідэнтам у пашыраным складзе і сам-насам. Галоўнай тэмай сталі кірункі выгаднага для абодвух бакоў эканамічнага супрацоўніцтва.

Сустрэчы папярэднічаў падарунак малдаўскаму боку ад беларускага: на бязвыплатнай аснове будуць перададзены пяць трактароў МТЗ-82 і дзве камунальныя машыны МАЗ. Адпаведны ўказ кіраўнік беларускай дзяржавы падпісаў напярэдадні. Такое рашэнне накіравана на ўмацаванне беларуска-малдаўскага супрацоўніцтва і далейшае развіццё адносін. Тэхніка прыбудзе ў Малдову ў самы бліжэйшы час.

СТАР. 2

ВЯСНА НА НЁМАНЕ

Фота БелТА.

На Аўгустоўскім канале адкрылі сезон воднага турызму. Фестываль «Нёманская вясна» сабраў каля 300 спартсменаў з Беларусі, Расіі і Украіны. На аднаместных і двухместных байдарках і катамаранах яны спаборнічалі ў праходжанні розных дыстанцый на бурнай рацэ Асташанка, непадалёк ад шлюза «Нямнова» на Аўгустоўскім канале. Арганізатарамі «Нёманскай вясны» выступілі Міністэрства спорту і турызму і ГА «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз», упраўленне спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама.

■ Вандроўка патрыёта

АДЧУЦЬ СЯБЕ ПЕРШАДРУКАРОМ І АКУНУЦЦА Ў КУПЕЛЬ

Карэспандэнт «Звязды» высвятляла, наколькі моцна ў Мсціславе адчуваецца дух даўніны

Новы праект — гэта даніна Году малой радзімы. Тэарэтычна мы ведаем турыстычны патэнцыял нашай краіны, наколькі ён багаты і разнастайны. Але наколькі зручная і даступная ўся гэтая прыгажосць турыстам-адзіночкам? Наш праект стане карысным дапаможнікам для аматараў такіх вандровак. Каб усё было без падману, абяцаю пасведчанне журналіста не выкарыстоўваць. Значыць, у дарогу? Сёння гэта Мсціслаў.

ХАЧУ Ў ПАРЫЖ АБО ЛОНДАН

Гэта я пра нашы беларускія «Парыж» і «Лондан». Той, хто хоць крышачку ведае Мсціслаў, у курсе, што там ёсць дамы з такімі назвамі. У XIX стагоддзі гэта былі камфартабельныя гасцініцы для прыезджых, а зараз тут жывуць звычайныя людзі. Скажу адно: звонку дамы выглядаюць нашмат лепей, чым унутры. Але жыхары ўсё роўна ганарацца: не кожнаму выпадае шчасце жыць у такіх знакамітых будынках. На фоне іх прывабных фасадаў любяць фатаграфавацца турысты.

СТАР. 4

Помнік Пятру Мсціслаўцу насупраць райвыканкама.

ФОРМУЛА МАЛДОВЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Падчас перагавораў з Прэзідэнтам Малдовы Ігарам Дадонам Аляксандр Лукашэнка расказаў, што, наведваючы былыя рэспублікі Савецкага Саюза, нідзе не адчувае такой настальгіі, як у Малдове: «Праязджаючы па цэнтральнай вуліцы Кішынёва, я больш за ўсё хацеў бы прайсці па ёй пешшу, як калісьці было ў савецкія часы. Я прызнаюся шчыра (гэта не для піяру нейкага, таму што я ў Малдове): лепшай зямлі я не бачыў і не сустракаў. Тут добрыя людзі, зямля, вельмі добры клімат».

Што да эканамічнага супрацоўніцтва, то Малдова зацікаўлена пераняць вопыт Беларусі ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці і сацыяльнай сферы. Пра гэта заявіў Ігар Дадон: «Для большасці грамадзян Малдовы тое, што адбываецца ў Беларусі, вельмі цікава. Не буду скрываць: яны хацелі жыць не горш, чым у Беларусі. У вас вельмі дынамічна развіваецца краіна, і нам цікава пераняць вопыт у розных сегментах: і ў сельскай гаспадарцы, і ў прамысловасці, і ў сацыяльнай сферы ў вас вельмі шмат праектаў».

У сваю чаргу Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў важнасць дружалюбных адносін з Малдовай. «Мы нямала зрабілі ў былыя часы і асабліва цяпер. Вы вырабляеце тое, чаго няма ў Беларусі. Мы родныя людзі (я гэтага ніколі не забываю і не забуду), ды і вам, якія б у вас ні былі палітычныя перавагі, беларусы — не чужыя людзі. У нас няма ніякіх геапалітычных, стратэгічных інтарэсаў тут, акрамя дружалюбных. Улічваючы тое, што мы блізкія людзі, і тое, што вы вырабляеце патрэбнае нам, мы купім у вас. А мы вырабляем тое, што трэба вам», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Беларускі бок гатовы не толькі гандляваць, але і ствараць сумесныя прадпрыемствы. У супрацоўніцтве нам нічога не перашкаджае, лічыць Прэзідэнт. Пры гэтым Беларусь гатова дапамагаць Малдове і ў падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў.

Кіраўнік беларускай дзяржавы даў, што ёсць шмат размоў пра арыентацыю Малдовы на Еўрапейскі саюз ці, наадварот, на Усход. І многія краіны не ведаюць, як развіваць супрацоўніцтва з ёй. «Трэба бачыць Малдову такой, якая яна ёсць. Мы такім прынцыпам і кіруемся», — выказаў сваю думку Аляксандр Лукашэнка. Ён лічыць, што невялікія дзяржавы павінны самі арыентавацца, з кім ім супрацоўнічаць. «Я формулу Прэзідэнта Малдовы прымаю на ўра: мы павінны бачыць усё добрае і там, і там», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ігар Дадон паведаміў, што Малдова разлічвае на адкрыццё авіярэйса Мінск — Кішынёў у найбліжэйшы час. Ён адзначыў, што Беларусь уваходзіць у дзясятку камерцыйных партнёраў яго краіны. У дзвюх краін ужо існуюць сумесныя прадпрыемствы па зборцы трактароў і тралейбусаў. «Спадзяюся, што мы будзем неўзабаве збіраць і аўтобусы», — сказаў Прэзідэнт Малдовы. Перспектыўным Ігар Дадон лічыць і ўдзел беларускіх кампаній у інфраструктурных праектах, у тым ліку ў будаўніцтве дарог, бо беларускія дарогі па якасці адны з самых лепшых у свеце.

Візіт працягваецца. Сёння адбудуцца перагаворы з прэм'ер-міністрам Малдовы Паўлам Філіпам.

Вераніка ПУСТАВІТ.

■ Справы вясеннія

ПА ЕЖЫ І ПРАЦА

З даўніх часоў хлеб быў галоўным клопатам чалавека. Караваем сустракалі гасцей, пачэснае месца ён заўсёды займаў на стале ў кожнай хаце. І сёння ніводнае свята не абыходзіцца без гэтага сімвала жыцця і працы. Але для таго, каб хлебам была забяспечана кожная сям'я, работу трэба пачынаць з вясны. Гэта добра разумеюць хлебаробы адкрытага акцыянернага таварыства «Лазавічы», што ў Клецкім раёне. Яны своечасова падрыхтавалі тэхніку да сяўбы і выйшлі ў поле.

Дваццаць два гады адну з найлепшых гаспадарак раёна ўзначальвае Міхаіл Аскерка. Таму вопыт кіраўніка, уменне разбірацца ў людзях, падбіраць кадры дазваляе арганізаваць калектыў на канкрэтныя справы.

На мехдвары мы засталі галоўнага інжынера Івана Цыгана. Іван Мікалаевіч у гаспадарцы больш за дзесяць гадоў.

— Уся тэхніка адрамантаваная, — кажа ён.

— З якімі цяжкасцямі сутыкнуліся пры падрыхтоўцы да вясенніх палявых работ? — пацікавілася ў спецыяліста.

— Нейкіх непрадбачаных сітуацый не было. Усе неабходныя запчасткі для тэхнікі набылі, — сцвярджае мой суразмоўнік. — Вось збіраюся ехаць па новы раскідвальнік мінеральных угнаенняў. Усяго ж на сяўбе будзе працаваць каля 15 адзінак тэхнікі. Гэтага дастаткова.

— Мы пачалі сяўбу 9 красавіка і справімся ў вызначаны тэрмін, — упэўнены дырэктар. — Ужо скончылі падкормку азімых, якіх засеялі 1160 гектараў. Работу завяршылі літаральна за пяць дзён. Прыступілі да падкормкі рапсу і сяўбы ранніх збожжавых, ячменю. Вобласць рэкамендуе закончыць работы да 29 красавіка. Але, мяркую, справімся раней. Акрамя таго, гаспадарка займаецца бульбай, цукровымі буракамі, кукурузай, якая пойдзе на зерне і зялёны корм. «Царыца палёў» зойме 600 гектараў.

Фота Анатоля БАСАВА.

Сямейная дынастыя ТАМАШЭНЯЎ.

У сёлетняй сяўбы свае асаблівасці. Восенню ішлі дажджы, глеба была пераўвільготненая. Пасля зімой выпаў снег, вясной яго яшчэ падкінула. Таму вада не паспела сцячы з палёў у асушальныя каналы. Гэтыя акалічнасці паўплывалі на тэрміны сяўбы: пачалася з затрымкай.

Але, як лічаць хлебаробы адкрытага акцыянернага таварыства, гэта не перашкода для таго, каб правесці яе ў сціслыя тэрміны. Галоўнае — арганізаванасць і, вядома, каб не падвяло надвор'е. Праблем з кадрамі практычна няма. «Спецыялістаў дастаткова, — сцвярджае дырэктар. — Мінеральнымі ўгнаеннямі забяспечаны нават лепш, чым у мінулым годзе».

На поле мы прыехалі апоўдні. І заспелі механізатараў за абедам. Як кажуць, добры работнік — сыты работнік. Таму ў гаспадарцы пастараліся найлепшым чынам арганізаваць харчаванне. Машына абсталяваная ўсім неабходным для ежы ў палявых умовах. Каля машыны ўвіхаецца раздатчыца Паўліна Цераховіч.

— Механізатары працуюць у розных месцах, часам вельмі аддаленых ад цэнтральнай сядзібы, але стараемся паспяваць усюды, — кажа жанчына. — Разумеем, што ад нашага спрыту залежаць вынікі пасяўной. Бо нездарма кажуць: як пад'ясі, так і папрацуеш.

— Меню ў нас разнастайнае, практычна кожны дзень мяняецца: галубцы, катлеты, баршчы, кураціна, на гарнір — бульба, кашы, макарона. Імкнёмся, каб нашы механізатары атрымлівалі таксама вітаміны — памідоры, агуркі. А яшчэ абавязкова — чай, какава, сокі.

Пасля таго як удзельнікі пасяўной паабедалі, машына вяртаецца ў сталовую гаспадаркі. А трэцяй гадзіне — зноў у поле, пачынаецца так званы падвячорак. І зноў жа — з гарачым харчаваннем. Прычым механізатары чакаюць машыну яшчэ і для таго, каб даведацца, якую норму яны выканалі за папярэдні дзень, параўнаць свае вынікі з вынікамі калег, паколькі такая зводка змешчана на бакавым шкле кабіны. Акрамя таго, у гонар пераможцаў на цэнтральнай сядзібе штодня падымаецца сцяг працоўнай славы.

Адзін са старажылаў гаспадаркі — Міхаіл Тамашэня — працуе брыгадзірам сорак чатыры гады, а яго агульны стаж складае пяцьдзясят восем гадоў. І ўсё на адным месцы. «Я люблю сваю зямлю, сваю гаспадарку, сваю вёску, — кажа ён. — І нічога іншага мне не трэба». Побач з дзедам працуюць і яго ўнукі — Алег Гаўрук і Міхаіл Тамашэня. Алег закончыў Клецкі сельскагаспадарчы прафесійны ліцэй, вучыцца ў Мар'інагорскім сельгаскаледжы. Цяпер ён праходзіць вытворчую практыку ў «Лазавічах». «Буду тут працаваць па размеркаванні, а затым прыйду на пастаянную работу: добрыя заробкі, калектыў, — кажа Алег Гаўрук. — Ёсць клуб, дзе можна адпачыць, схадзіць на дыскатэку. Але пакуль не да забаў — пасяўная».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

■ Парламенцкі дзённік

АДЧУВАЛЬНАЕ ПЫТАННЕ

Учора прайшоў круглы стол «Прававыя аспекты адмены смяротнага пакарання»

На ім гаварылі пра гістарычныя і юрыдычныя пункты погляду, альтэрнатыўныя меры, ролю парламентарыяў і грамадзянскай супольнасці ў абмеркаванні гэтай тэмы. У мерапрыемстве акрамя дэпутатаў удзельнічалі міжнародныя эксперты, прадстаўнікі Канстытуцыйнага суда, Міністэрства юстыцыі, Генеральнай пракуратуры, няўрадавых арганізацый.

Андрэй НАУМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі і кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу па вывучэнні праблематыкі смяротнага пакарання як інструмента, які скарыстоўваецца ў Беларусі, адзначыў, што зараз гэта пытанне на этапе абмеркавання. «Прайшло ўжо больш за 20 гадоў (пасля рэферэндуму. — **Аўт.**), і, каб грамадзян Рэспублікі Беларусь інфармаваць па дадзенай праблематыцы, мы прынялі ў мінулым годзе рашэнне наведваць рэгіёны», — сказаў Андрэй Наумовіч. Ён растлумачыў, што падчас такіх выездаў праводзяцца сустрэчы з дэпутатамі Саветаў і мясцовым кіраўніцтвам, грамадскай супольнасцю, а таксама з моладдзю — тымі, хто зараз становіцца актыўным удзельнікам усіх палітычных падзей, але не прымаў удзел у рэферэндуме 1996-га.

На думку старшыні парламенцкай камісіі, мы павольна ідзём да адмены смяротнага пакарання. Таксама Андрэй Наумовіч не выключае правядзення паўторнага рэферэндуму. Наконт парламенцкіх слуханняў па гэтай тэме ён адзначыў, што мае сэнс іх правесці, калі большасць дэпутатаў будзе гатовая да абмеркавання і прыняцця станоўчага рашэння.

Таццяна ЦЕРМАЧЫЧ, кіраўнік аддзела каардынацыі і міжнароднага супрацоўніцтва Савета Еўропы, пацвердзіла, што дыялог па праблематыцы смяротнага пакарання ідзе з усімі галінамі ўлады, таксама актыўна ўцягнутая ў абмеркаванне грамадская супольнасць. Спадарыня Цермачыч лічыць, што праца рабочай групы, якую ўзначальвае Андрэй Наумовіч, вельмі важная.

Андрэа ВІКТАРЫН, кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі, заўважыла, што зараз абмеркаванне магчымасці ўвядзення мараторыя на смяротнае пакаранне ці яго адмены стала не такім напружаным. На яе думку, смяротны прыгавор шкодзіць не толькі сваякам асуджанага, але і тым, хто яго выносіць і выконвае. Калі праводзіўся рэферэндум, у беларускім заканадаўстве не было магчымасці заключыць чалавека пажыццёва: гэта пакаранне, як выключнае і альтэрнатыўнае смяротнаму, было ўведзена ў Крымінальны кодэкс Беларусі толькі ў канцы 1997-га.

Надзея АНІСОВІЧ

■

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ДЗЯРЖДЭП АПАВЯСЦІЎ ПАСОЛЬСТВА РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ Ў ВАШЫНГТОНЕ, ШТО НОВЫХ САНКЦЫЙ ПАКУЛЬ НЕ БУДЗЕ

Яшчэ ў панядзелак газета The Washington Post напісала, што прэзідэнт ЗША Дональд Трамп быў незадаволены з-за анансавання чарговых абмежаванняў, бо яшчэ не прыняў рашэння наконт іх увядзення. Крыніца выдання ў Вашынгтоне паведаміла, што прэзідэнт не пойдзе на новыя санкцыі «без чарговага правакацыйнага кроку з боку Расіі».

Пры гэтым анонс новых санкцый сапраўды меў месца: яго зрабілі пасол ЗША ў Расіі Джон Хантсман, які накіраваў у расійскае МЗС адпаведны ліст, і пастаянны прадстаўнік ЗША пры ААН Нікі Хэйлі, якая назвала нават канкрэтную дату — 16 красавіка. Новыя санкцыі меркаваліся як адказ ЗША на дзеянні Расіі ў Сірыі, аднак ні 16 красавіка, ні пазней яны так і не былі афіцыйна аб'яўлены.

ТРАМП ПАВЕДАМІЎ АБ ПРАМЫХ ПЕРАГАВОРАХ З КНДР

ЗША вядуць прамыя перагаворы з Паўночнай Карэяй, заявіў прэзідэнт Дональд Трамп на сустрэчы з японскім прэм'ерам Сіндза Абэ, паведамляе Reuters.

«У нас былі прамыя перагаворы на вельмі высокім узроўні, надзвычай высокім узроўні, з Паўночнай Карэяй», — сказаў Трамп падчас фотасесіі з Абэ. «Паглядзім, што будзе, таму што ў канчатковым выніку залічваецца вынік, а не самі сустрэчы або нашы разважанні пра іх», — дадаў Прэзідэнт ЗША.

Ён не стаў удакладняць, хто ўдзельнічае ў перагаворах з абодвух бакоў і які ўзровень трэба лічыць «надзвычай высокім».

У той жа час прэзідэнт ЗША дапусціў, што намаганні па арганізацыі перагавораў на вышэйшым узроўні могуць не завяршыцца поспехам і яго перамовы з Кім Чэн Ынам не адбудуцца.

Раней, 9 красавіка,Трамп заявіў, што чакае сустрэчы з кіраўніком Паўночнай Карэі Кім Чэн Ынам у маі або пачатку чэрвеня. Ён пацвердзіў, што Пхеньян гатовы да абмеркавання дэнуклеарызацыі, і выказаў надзею, што такую здзелку ўдасца заключыць.

Тым часам амерыканская газета The Washington Post паведаміла ў сераду, што дырэктар ЦРУ і будучы кіраўнік Дзярждэпартамента ЗША Майк Пампеа ў абстаноўцы поўнай сакрэтнасці нанёс візіт у КНДР у якасці пасланца Дональда Трампа. Падчас паездкі, якая адбылася на велікодныя выхадныя (31 сакавіка — 1 красавіка), Пампеа сустрэўся з лідарам КНДР Кім Чэн Ынам. Гэтую інфармацыю агенцтву АР пацвердзілі два высокапастаўленыя амерыканскія чыноўнікі.

■ Вышэйшая школа

ЖУРФАК ВЯРТАЕ НАЗВУ

Савет БДУ прыняў рашэнне рэарганізаваць Інстытут журналістыкі. Замест яго ў структуры ўніверсітэта з'явяцца два самастойныя падраздзяленні.

Як растлумачылі ў прэс-службе ВНУ, стратэгічнай для БДУ задачай на сённяшні дзень з'яўляецца павышэнне якасці адукацыі. Яна будзе вырашацца праз аптымізацыю структуры спецыяльнасцяў, развіццё сістэмы дыстанцыйнага навучання, акумуляцыю фінансавых сродкаў.

Яшчэ адзін важны крок — стварэнне агульнаўніверсітэцкага факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі. У Інстытуце журналістыкі такі факультэт паспяхова дзейнічаў. Цяпер ён будзе выведзены з яго структуры і яму прысвояць статус адзінага навукова-метадычнага і каардынацыйнага цэнтра дадатковай адукацыі дарослых у комплексе БДУ.

Неабходнасць акумулявання існуючага навукова-інтэлектуальнага патэнцыялу ў адной структуры, сыходу ад аднолькавых спецыяльнасцяў перападрыхтоўкі была падтрымана на Савеце БДУ практычна аднагалосна. Таксама члены Савета разгледзелі пытанне аб неабходнасці перайменавання факультэта журналістыкі. Змена назвы выклікана актыўным развіццём існуючых кірункаў падрыхтоўкі. На факультэце рыхтуюць кадры як для СМІ, так і для сферы публічнай інфармацыйнай прасторы. Факультэт журналістыкі фактычна перастаў быць монафункцыянальным з 1996 года, калі распачалася падрыхтоўка па спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя». Па ініцыятыве кафедры тэхналогій камунікацыі ў 2013 годзе ў агульнадзяржаўны класіфікатар прафесій унеслі пасады «спецыяліст па сувязях з грамадскасцю» і «спецыяліст па рэкламнай камунікацыі». Гэта дазволіла легітымізаваць згаданыя віды дзейнасці і забяспечыць выпускнікоў працоўнымі месцамі.

Перайменаванне ў адпаведнасці з наяўнымі праграмамі падрыхтоўкі дасць магутны імпульс інавацыйнаму развіццю факультэта. Дарэчы, у наступным навучальным годзе плануецца ўпершыню ў Беларусі адкрыць новую спецыяльнасць у магістратуры «Медыякамунікацыі».

Савет БДУ разгледзіць пытанне аб новай назве факультэта да канца красавіка, прыцягваючы да яго абмеркавання прадстаўнікоў асноўных заказчыкаў кадраў.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Надвор'е

Подых холаду са Скандынавіі

У нядзелю нават удзень будзе толькі 9—17 цяпла

На гэтым тыдні атмасферныя франты выціснулі цёплае паветра за межы нашай краіны. А потым з паўночна-заходнімі патокамі ў атмасферы да нас накіравалася няўстойлівае і больш халоднае паветра з поўначы Скандынавіі. У найбліжэйшыя дні чакаецца няўстойлівае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўдзень пераважна па ўсходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём на большай частцы тэрыторыі чакаецца паўночна-заходні, паўночны вецер парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра будзе ад плюс 10 да плюс 16 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны паветра прагрэецца да 18 цяпла. У пятніцу пры павышаным фоне атмасфернага ціску будзе без істотных ападкаў. Тэмпература ўначы апусціцца да плюс 3—8 градусаў, удзень стане крыху цяплей і будзе ад плюс 14 па паўночным усходзе да плюс 22 па паўднёвым захадзе краіны.

Пад уплывам атмасферных франтоў ад цыклону, які будзе перамяшчацца ўздоўж паўночна-ўсходніх межаў Беларусі, у суботу ўначы па поўначы, а днём пераважна па паўночна-ўсходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Раніцай і ўдзень у многіх раёнах краіны чакаецца моцны парывісты вецер. Уначы будзе 6—11 цяпла, а ўдзень — ад 13 цяпла па поўначы да плюс 24 градусаў па поўдні краіны. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у нядзелю захаваецца няўстойлівае ветранае надвор'е і стане халадней.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Стыхія

За тры выхадныя — 199 узгаранняў

Менавіта такую колькасць паведамленняў работнікі МНС атрымалі за мінулыя выхадныя — з 15 па 17 красавіка — аб пажарах у экасістэмах.

Большая частка сігналаў паступіла 15 красавіка — 105. З іх 19 званкоў прыйшлося на Мінскую вобласць. 16 красавіка адбылося 56 пажараў у экасістэмах у 21 раёне краіны. Большая частка ўзгаранняў прыпала на Смалявіцкі і Барысаўскі раёны — 10 і 9 надзвычайных здарэнняў адпаведна. У аўторак, 17 красавіка, такіх выпадкаў было 38. Прыродныя пажары былі зарэгістраваны ў 17 раёнах краіны. У Вілейскім і Смалявіцкім раёнах адбылося па 5 узгаранняў, у Мсціслаўскім — 4.

Дзе паводкавыя, дзе талыя...

У краіне зарэгістраваны падтапленні ў 13 раёнах, паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях.

Паводкавымі і талымі водамі падтоплены 219 падворкаў, 18 падвалаў жылых дамоў, 78 гаспадарчых пабудоў, 16 участкаў дарог і 4 нізкаводныя масты.

Падтапленні зарэгістраваны ў Віцебскай (два раёны), Гомельскай (восем раёнаў), Магілёўскай (шэсць раёнаў) і Мінскай (адзін раён) абласцях. У прыватнасці, паводкавымі водамі падтоплены 194 падворкі, 18 падвалаў жылах дамоў і 66 гаспадарчых пабудоў, 14 участкаў дарог і 4 нізкаводныя масты, талымі — 25 падворкаў, 12 гаспадарчых пабудоў і два ўчасткі дарогі. Транспартныя зносіны з населенымі пунктамі і жыццезабеспячэнне насельніцтва не парушаны. Вядзецца маніторынг гідралагічнай абстаноўкі.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Спорт-тайм

Узлёт Арыны

У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра абноўлены рэйтынг Жаночай тэніснай асацыяцыі, выступленне беларускіх гандбольных клубаў і чарговы тур чэмпіянату краіны па футболе.

1. ***Арына Сабаленка ўпершыню ў кар'еры ўвайшла ў топ-50 сусветнага рэйтынга.*** Гэта адбылося пасля ўдалага выступлення на турніры ў швейцарскім Лугана, дзе беларуска дайшла да фіналу. Сабаленка паднялася на 14 пазіцый і займае цяпер 47-е месца, набраўшы 1128 ачкоў. У Аляксандры Сасновіч 56-я пазіцыя, Вікторыя Азаранка знаходзіцца на 95-м месцы, Вера Лапко займае 111-ы радок у рэйтынгу Жаночай тэніснай асацыяцыі.

Нагадаем, у канцы гэтага тыдня беларуская зборная, за якую згуляюць Сабаленка, Сасновіч, Лапко і Лідзія Марозава, сустрэнецца ў матчы Кубка Федэрацыі з камандай Славакіі. Гульня за права застацца ў элітным дывізіёне каманднага чэмпіянату свету пройдзе 21—22 красавіка на корце мінскай «Чыжоўка-Арэны».

Тым часам Максім Мірны і аўстрыец Філіп Освальд сталі пераможцамі парнага разраду на турніры ў амерыканскім Х'юстане. Гэта 52-і тытул 40-гадовага Максіма Мірнага ў парных турнірах пад эгідай Асацыяцыі тэнісістаў-прафесіяналаў.

2. ***Беларуская жаночая каманда па спартыўнай акрабатыцы ў складзе Юліі Івончык, Веранікі Набокінай і Карыны Сандовіч заваявала сярэбраны медаль на чэмпіянаце свету ў Антверпене (Бельгія).*** Мацнейшымі за нашых дзяўчат сталі толькі расіянкі. Нашы спартсмены прэтэндавалі на медаль і ў фінале ў мужчын, але Арцём Яшчанка і Аляксей Заяц у спаборніцтве дуэтаў не змаглі падняцца на п'едэстал.

Адзначым, што на чэмпіянаце свету па спартыўнай акрабатыцы ў Антверпене выступаюць 170 спартсменаў з 19 краін.

3. ***Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова ў матчы за «бронзу» SEHA-лігі саступіў славенскаму «Цэле» 28:31.*** Нагадаем, у паўфінале БГК прайграў мясцоваму «Вардару» (24:33), а ў паралельным матчы «Цэле» мінімальна саступіў харвацкаму «Заграбу» (28:29).

Гандбалісты македонскага «Вардара» ў вырашальным матчы «фіналу чатырох» SEHA-лігі абыграліх харвацкі «Заграб» 26:24 і сталі пераможцамі турніру.

Мінскі СКА заняў трэцяе месца ў розыгрышы Балтыйскай лігі, які завяршыўся ў эстонскай Пылве. У матчы за выхад у фінал армейцы саступілі фінскаму «Рыіхімякі» (25:27), а ў матчы за «бронзу» падапечныя Ігара Папругі перайгралі ўкраінскі ЗТР з Запарожжа ў дадатковы час з лікам 40:37.

Зараз беларускія клубы засяродзяцца на справах чэмпіянату Беларусі. Ужо 21 красавіка ў Брэсце адбудзецца паядынак БГК супраць мінскага СКА.

4. ***Адбыліся матчы 3-га круга чэмпіянату краіны па футболе.*** Мінскае «Дынама» перамагло ў гасцях «Гарадзею» з лікам 2:0, БАТЭ перайграў «Дынама» (Брэст) — 2:0, «Шахцёр» (Салігорск) з мінімальным лікам саступіў «Слуцку» — 0:1, «Прамень» (Мінск) аказаўся слабейшым за «Віцебск» — 0:2, сустрэча «Іслачы» (Мінскі раён) і «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) скончылася з лікам 0:0. Яшчэ шэраг сустрэч скончыліся з нічыйным вынікам: «Смалявічы» — «Мінск» — 1:1, «Нёман» (Гродна) — «Дняпро» (Магілёў) — 0:0, «Гомель» — «Тарпеда» (Мінск) — 0:0.

Лідзіруе ў чэмпіянаце дзейны чэмпіён краіны БАТЭ, які набраў 9 ачкоў з дзевяці магчымых, па 7 балаў у «Віцебска», «Дняпра» і мінскага «Дынама».

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ

■ Год малой радзімы

АСТРАМЕЧАВА: КРАЯЗНАЎЧЫ ЛЕТАПІС ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Бібліятэка альманаха «Астрамечаўскі рукапіс» працягвае пашырацца: пабачыў свет дваццаць першы нумар Брэсцкага раённага краязнаўчага штоквартальніка.

Артыкулы, нарысы, фальклорныя запісы, мастацкія творы па традыцыі расказваюць пра Астрамечава і ваколіцы. Публікацыі змешчаны ў традыцыйных раздзелах: «Астрамечава і астрамечаўцы», «Чароўныя спевы і паданні спадчыны», «Народныя святы і звычаі Берасцейшчыны», «Скарбніца народных талентаў», «Літаратурная сядзіба» , «Вернісаж», «Старонкі гісторыі», «Карані», «Калаўрот культурнага жыцця». Прыемна, што аўтары, укладальнікі альманаха разумна спалучаюць культурна-асветніцкую праблематыку з разглядам сацыяльных клопатаў рэгіёна. Тым самым ствараецца яго партрэт як культурнага, асветніцкага «гнязда» Берасцейшчыны.

Многія публікацыі ў чарговым выпуску «Астрамечаўскага рукапісу» ўражваюць, прымушаюць задумацца пра этнаграфічную, фальклорную памяць берасцейцаў, жыхароў краю. Як, напрыклад, і гэтая вандроўная справаздача — «Валачобныя песні Прыбужжа». Нагадаем, што валачобныя песні — гэта вяршыня беларускай мастацка-паэтычнай культуры. У іх, як у люстэрку, адбіваюцца здабыткі, вартасці найлепшых каляндарна-песенных жанраў. Пачаткі, вытокі паэзіі такога гарту, — у працоўна-магічных уяўленнях старажытнага чалавека. Публікацыю «Валачобныя песні Прыбужжа» для альманаха падрыхтавала метадыст па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Метадычнага цэнтра Брэсцкай раённай цэнтралізаванай клубнай сістэмы Алена Паддубная. Нельга не сказаць, што рэдактару і ўкладальніку выдання члену Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандру Валковічу пашчасціла: вакол альманаха сабраліся апантаныя, руплівыя збіральнікі народнай памяці — студэнты і выкладчыкі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Найперш — кіраўнік лабараторыі «Фальклярыстыка і краязнаўства» доктар філалагічных навук Іна Швед і яе вучні.

І ў першым за гэты год выпуску «Астрамечаўскага рукапісу» шмат увагі ўдзелена дэкаратыўна-прыкладному мастацтву берасцейцаў, выяўленчаму мастацтву ў Брэсце, Брэсцкім раёне. З краязнаўчых публікацый вылучаецца гістарычны нарыс пра школу вёскі Яцкавічы Брэсцкага раёна.

«Астрамечаўскі рукапіс» заслугоўвае самай шырокай чытацкай увагі. І не толькі ў Брэсцкім раёне, Брэсце, але і ўвогуле сярод цікаўных да беларускага краязнаўства чытачоў. Вопыт Брэсцкага раённага выканаўчага камітэта, Брэсцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сеткі варты пераймання па ўсёй краіне. Нельга не заўважыць гэтую ініцыятыву, асабліва ў Год малой радзімы.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

АДЧУЦЬ СЯБЕ ПЕРШАДРУКАРОМ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Каб цалкам адчуць энергетыку горада, трэба пабываць на тутэйшым Мсціслаўскім фэсце, а потым вярнуцца іншым разам. І не мае значэння, якая гэта будзе пара года. Я, напрыклад, выбрала пачатак вясны. Калі вакол яшчэ шэра, сумна і не надта ўтульна. Але калі душа шукае прыгод і хочацца памяняць абстаноўку, трэба ехаць. Я адразу ж паставіла мэту нарэшце ўважліва вывучыць калекцыю мясцовага гісторыка-археалагічнага музея, даведацца, як выглядае ў будны дзень Замкавая гара з яе драўлянымі пабудовамі, наведаць Кармеліцкі касцёл Успення Божай маці, старадаўнія праваслаўныя храмы з іх цудатворнымі абразамі. Добра яшчэ, што ўсе гэтыя славутасці знаходзяцца, лічы, у адным месцы — у цэнтральнай частцы горада. Але для чалавека, які прыедзе сюды ўпершыню, усё ж такі добра будзе трымаць пад рукой карту Мсціслава. На жаль, у тутэйшых крамах я яе не знайшла. Таму раю адразу, як толькі прыбудзеце на аўтастанцыю, сфатаграфаваць планіроўку горада, што размешчана на стэндзе. Дзякуй тым, хто здагадаўся гэта зрабіць. Дарэчы, такі прыклад можна браць іншым на ўзбраенне. Асабліва калі горад маленькі і, як кажуць мясцовыя жыхары, там нама чаго паглядзець.

ГІСТОРЫЯ Ў ЭКСПАНАТАХ

Дарогу да гісторыка-археалагічнага музея ў Мсціславе знайсці проста, у крайнім выпадку яе вам падкажа любы гараджанін. Панядзелак — не самы прыдатны дзень для актыўнага наведвання музея, хоць адміністрацыя працуе. І калі я з'явілася на парозе, мяне з задавальненнем прынялі. Можна было сэканоміць на экскурсіі і самастойна пахадзіць па залах, але ж гэта нецікава. Тым больш што 2 рублі 40 капеек — не такія вялікія грошы. Галоўны захавальнік Юлія Харальцова — сама, дарэчы, ураджэнка гэтага горада — цэлую гадзіну з захапленнем расказвала пра мінулае і сучаснае Мсціслава. Першае ўпамінанне пра яго адносіцца да 1135 года, але горад існаваў і раней, кажа яна. Яго заснаваў Расціслаў Мсціслававіч — унук Уладзіміра Манамаха — і назваў у гонар свайго бацькі Мсціслава Вялікага. Сын князя Расціслава Раман далучыў горад да Смаленскага княства, а пры яго ўнуку той заваяваў вялікі літоўскі князь Альгерд Гедзімінавіч і перадаў свайму сыну Лугвенію. Мсціслаў быў на мяжы ВКЛ з Расійскай імперыяй і яго пастаянна імкнуліся заваяваць. Таму ў музейнай экспазіцыі шмат зброі, пачынаючы ад наканечнікаў коп'яў і стрэл і заканчваючы алебардамі, баявымі сякерамі і ядрамі.

Цераз раку Віхру, на правым беразе якой знаходзіўся старажытны горад, праходзіў знакаміты гандлёвы шлях з варагаў у грэкі. У музеі ёсць цікавая калекцыя нумізматыкі і нават скарб. Ён быў знойдзены ў 90-я гады мінулага стагоддзя мясцовым жыхаром і перададзены музею. Гэта

Рыцары, зробленыя рукамі сапраўднага майстра Аляксандра ПАПОВА.

соліды і грошы часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

ДЗЕ ВЫКЛАДАЛІ КОЛАС І ГАРЭЦКІ

Мсціслаў наогул заўсёды быў прагрэсіўным горадам. Шмат яго ўраджэнцаў сталі вядомымі на ўвесь свет. Жыхары ганарацца сваім славутым земляком Пятром Мсціслаўцам. Тым самым, які разам з Іванам Фёдаравым надрукаваў у Маскве першую кнігу на рускай мове «Апостал». Мсціслаў — адзін з нямногіх райцэнтраў, дзе перад райвыканкамам замест помніка правадыру рэвалюцыі стаіць скульптура першадрукару. У музеі ёсць зроблены пад даўніну друкарскі станок XVI стагоддзя, і тут дазваляюць турыстам адчуць сябе Пятром Мсціслаўцам — зрабіць на памяць адбітак на паперы.

У горадзе існавалі жаночая і мужчынская гімназіі. У 20-я гады мінулага стагоддзя ў мужчынскай гімназіі размяшчаўся педагагічны тэхнікум, дзе выкладалі Якуб Колас і Максім Гарэцкі. Зараз будынак зачынены па прычыне яго аварыйнага стану. Перад закрыццём тут размяшчалася 1-я гарадская школа.

Дарэчы, ахвотныя могуць здзейсніць вандроўку не толькі па музеі, але і па горадзе. І даведацца яшчэ шмат чаго карыснага пра тутэйшыя аб'екты. Танней гэта зрабіць у складзе групы, але не адмовяць нават аднаму чалавек. Каштуе экскурсія 9 рублёў. Заадно будзе нагода ацаніць памеры таго няшчасця, якое адбылося не так даўно з адным з найпрыгажэйшых будынкаў горада — касцёлам езуіцкага калегіума. Абрынулася адна з яго сцен, і зараз ідзе збор грошай, каб выратаваць гэты ўнікальны помнік даўніны. Плануецца, што частка сродкаў ад абласнога суботніка будзе накіравана менавіта на яго аднаўленне.

У музеі каледжа.

А яшчэ, калі будзе магчымасць, абавязкова наведайце сабор Аляксандра Неўскага. Там знаходзяцца часткі мошчаў гэтага святога і Матроны Маскоўскай. А яшчэ там ёсць ікона Расціслава — заснавальніка Мсціслава. Ён быў далучаны да ліку святых як міратворац. За час яго праўлення не было ніводнай вайны, што ў Сярэднявеччы лічылася вялікай рэдкасцю. І яшчэ вельмі цікавая акалічнасць. У саборы ёсць цудатворная ікона Іверскай Божай Маці. Там расказалі, што яе быццам падараваў храму апошні рускі цар Мікалай II.

МУЗЕЙ ПАЧЫНАЕЦЦА З ЛЕСВІЦЫ

Вывучаць гісторыю ў Мсціславе можна па гістарычных малюнках, якія зрабілі на бетоннай агароджы сваёй установы выхаванцы Мсціслаўскага дзяржаўнага будаўнічага каледжа. Апошні, дарэчы, заслугоўвае, каб пра яго расказаць асобна. Пачула ад мясцовых, што там знаходзіцца ўнікальны музей. Не спадзявалася, што мяне прымуць, але пайшла. І мяне, турыстку, не толькі прынялі, але нават правялі экскурсію. Экспанатаў у музеі так шмат, што сёлета тут збіраюцца адкрыць яшчэ адну залу.

У вытокаў музея стаяў гісторык Уладзімір Шылянкоў, яго справу працягнулі выкладчыкі Ганна і Барыс Панцялеевы. Сам будынак, дзе размешчаны экспазіцыі, адносіцца да першай паловы XIX стагоддзя. Нават лесвіца, якая вядзе на другі паверх, арыгінальная. І прыступкі, і поручні — металічныя. Некаторыя балясіны ад часу прыйшлі ў непрыдатнасць, і таленавітыя навучэнцы пад кіраўніцтвам майстра Аляксандра Папова зрабілі новыя. Заўважыць розніцу немагчыма. Хоць старадаўнія былі літыя, а новыя — звараны. Калі ўбачыце на адной з цэнтральных вуліц фігуры рыцараў, ведайце — гэта справа рук Аляксандра Паўлавіча. Яго металічныя скульптуры можна сустрэць і ў іншых куточках горада.

А музей раю наведаць усім. Акрамя вельмі цікавай залы па гісторыі гэтай навучальнай установы, тут ёсць яшчэ вялікая калекцыя прадметаў быту мсціслаўскага краю. І рэчы сустракаюцца па-сапраўднаму ўнікальныя.

У СЭРЦЫ МСЦІСЛАВА

Замкавая гара — гэта тое самае месца, дзе пачыналася жыццё слаўнага горада. Дзякуючы магілёўскім археолагам сёння любы ахвотны можа паглядзець тут частку бруку XI—XII стагоддзяў і знаходкі, якія былі зробленыя падчас раскопак. Усё гэта размешчана пад дахам, каб надвор'е не сапсавала ўнікальны кавалачак даўніны. Тым, хто збіраецца гэта ўбачыць, трэба звярнуцца ў гісторыка-археалагічны музей. Бо раскоп, як і вежа-данжон знаходзяцца на замку. Але можна проста пагуляць па тэрыторыі. З верасня па красавік уваход на Замкавую гару адкрыты з 10 гадзін раніцы да 17.00. У летні час — да 22.00. З гары можна спусціцца да сакральнай святыні горада — кагальнага калодзежа. Вельмі прыгожае намоленае месца. Тут б'юць чыстыя, як сляза, крыніцы і ёсць магчымасць акунуцца ў купель. Час у такіх умовах ляціць непрыкметна. Не паспела аглянуцца, як брамы замкавай крэпасці ўжо зачыніліся. Прыйшлося вяртацца ў горад іншым шляхам. Але тым, хто не ведае мясцовасці, трэба ўсё ж такі пільна сачыць за гадзіннікам.

ЦЭННІК ВАНДРОЎКІ

Тое, што Мсціслаў прывабны для турыстаў, — гэта безумоўна. Пры вялікім жаданні сюды можна дабрацца без праблем. З Магілёва ў будны дзень з аўтавакзала курсіруе некалькі маршрутаў. Чыгункі ў Мсціславе, на жаль, няма. Бліжні населены пункт, да якога можна дабрацца на цягніку, — аграгарадок Ходасы, ад якога каля 20 кіламетраў да Мсціслава. На афіцыйным сайце райвыканкама ёсць тэлефоны тутэйшай гасцініцы з аднайменнай назвай «Мсціслаў». Яна знаходзіцца ў цэнтры горада. За аднаместны нумар мне прыйшлося аддаць 21 рубель. Шчыра кажучы, свае лепшыя часы гасцініца бачыла даўно, таму відавочна мае патрэбу ў рамонце.

Цяпер што датычыцца харчавання. У горадзе ёсць сімпатычныя кавярні, але сціплы перакус там можа каштаваць каля 5 рублёў. У рэстаране «Віхра» нават атрымалася паснедаць танней. Порцыя бульбяных аладак, напрыклад, каштавала каля 2 рублёў, што нават танней, чым у кавярні.

Было вялікае жаданне з'ездзіць у Пустынскі манастыр, што за 10 кіламетраў ад горада. Але, на жаль, з аўтастанцыі туды аўтобусы не ходзяць — нерэнтабельны маршрут. Можна скарыстацца таксі, але толькі ў адзін бок дарога абыдзецца ў 10 рублёў. І столькі ж назад. Ёсць магчымасць даехаць на аўтобусе да Малой Багацькаўкі, радзімы нашага славутага пісьменніка Максіма Гарэцкага. Але, каб наведаць мясцовы музей, трэба спачатку дамовіцца са спецыялістамі раённага гісторыка-архітэктурнага музея. Не пашкадуеце.

Пэўную суму выдаткавала на сувеніры. Вельмі раю наведаць тутэйшы Дом рамёстваў, дарогу ў які падкажа любы жыхар. Выбар там сапраўды вялікі, шмат сувеніраў з беларускай сімволікай. Асабіста я купіла сабе талерку з выявай Кармеліцкага касцёла за 6 рублёў. Павесіла на сцяну і любуюся. Да чаго ж прыгожа!

Вандравала Нэлі ЗІГУЛЯ.

■ Касмічныя падзеі

ЁН ПРАЛЯЦЕЎ ПОБАЧ...

Астраномы заўважылі буйны астэроід, які размінуўся з Зямлёй усяго за 21 гадзіну да магчымай сустрэчы

Як паведамляе партал space.com, у нядзелю міма Зямлі праляцеў даволі буйны астэроід памерам з футбольнае поле. Самае цікавае ў гэтай навіне тое, што астраномы NASA, якія працуюць у абсерваторыі ў Арызоне, выявілі гэты астэроід усяго толькі за некалькі гадзін да таго, як ён праляцеў міма нашай планеты, што чарговы раз сведчыць на карысць неабходнасці развіцця нашых сістэм планетарнай бяспекі.



Праз усяго 21 гадзіну з моманту выяўлення астэроід 2018 GE3 наблізіўся на вельмі дыскамфортную (прынамсі, з псіхалагічнага пункту гледжання) адлегласць ад нашай планеты. З хуткасцю прыблізна 106 000 кіламетраў за гадзіну касмічная глыба праляцела на адлегласці, роўнай палове дыстанцыі паміж Зямлёй і Месяцам. Па зямных мерках гэта, вядома, не так уражвае, аднак па касмічных... Напэўна, у момант назірання за ім па спінах астраномаў не раз прабег халадок, асабліва калі ўлічыць памеры гэтага аб'екта. Яны больш паходзяць на памеры вялізнага супермаркета. Па папярэдніх падліках, шырыня яго можа складаць ад 65 да 100 метраў, гэта значыць ён прыкладна ў 3,6 раза большы за аб'ект, што выбухнуў над сібірскай тайгой у 1908 годзе.

Цалкам нескладана ўявіць, якія наступствы нас чакалі б, калі б астэроід гэты «вырашыў» змяніць напрамак і накіравацца проста да Зямлі. Калі б упаў GE3 на Зямлю, гэта выклікала б не глабальныя, але рэгіянальныя разбурэнні. Цалкам магчыма, што аб'ект часткова разваліўся б пры ўваходзе ў атмасферу. Тым не менш гэта даволі буйны астэроід. Ён чарговы раз прадэманстраваў, што нават вялікія касмічныя камяні могуць здзіўляць сваім нечаканым з'яўленнем. Складанасць выяўлення астэроідаў у першую чаргу звязана з іх памерамі і нізкім альбеда (адбівальнай асаблівасцю). Акрамя таго, яны рухаюцца вельмі хутка, таму даволі складана іх адсачыць.

Сяргей КУРКАЧ

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

19 КРАСАВІКА 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 8 (15839)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Анжаліка ПУШНОВА:

«Найперш я — спявачка»

Дзяўчына толькі сёлета заканчвае Інстытут журналістыкі, а ў яе «паслужным спісе» ўжо два ўдзелы ў нацыянальным адборы на «Еўрабачанне» і стажыроўкі на ўсіх тэлеканалах краіны. У сакавіку ў маладой артысткі выйшаў дэбютны кліп на песню «У цішыні». Сваю творчасць і вучобу яна сумяшчае з працай на тэлебачанні: у ранішнім вяшчанні на АНТ у суразмоўніцы свая рубрыка «Дзяжурны па горадзе». У інтэрв'ю Анжаліка Пушнова расказала, з чаго пачыналася яе творчасць, як тата-прадзюсар уплывае на кар'еру і прыадчыніла таямніцы свайго асабістага жыцця.

— Анжаліка, як вас лепш прадставіць: спявачка, артыстка ці журналіст?

— На першым плане ўсё ж такі заўсёды ідзе спявачка, таму што гэта быў мой выбар з пяцігадовага ўзросту, можа быць, дзесьці ўсвядомлены, а дзесьці — не. Быў такі момант, калі я паспрабавала спыніцца на журналістыцы канчаткова, забыцца пра канцэрты і выступленні, але зразумела, што не магу так жыць. Адчувала, што быццам не хапае часткі мяне, таму вырашыла ўсё сумяшчаць, як робяць многія ў маёй сферы. Пакуль што гэта ўдаецца.

— Выходзіць, артыстычная кар'ера пачалася з пяці гадоў?

— Так. Бацькі ўбачылі, як маленькая Анжаліка іграе на цацачным фартэпіяна і зразумелі, што трэба аддаваць дзяўчынку ў музыку. Потым былі розныя гурткі, дзіцячыя студыі. Дарэчы, менавіта заняткі вакалам зрабілі мяне «гучным» дзіцем, таму што да іх, як кажуць бацькі, я была вельмі спакойнай, сціплай дзяўчынкай. А потым пачаліся ранішнікі, дзе ўсе песні і танцы былі маімі.

Дарэчы, тата з'яўляецца маім прадзюсарам, дырэктарам, менеджарам, таму ён заўсёды са мною побач. У маладосці бацька таксама спяваў, круціўся ў гэтых колах, і хоць у яго і няма прафесійнай адукацыі, сфера яму знаёмая. Не буду хаваць, былі розныя моманты, у тым ліку, калі мы сварыліся, разыходзіліся ў меркаваннях. Ён кінуў музыку, я займалася ўсім сама, але нядаўна зноў падцягнула яго да справы. Чым больш выступаю на сцэне, тым больш пераконваюся: у тым, што ён мой прадзюсар, толькі плюс. Ні адзін іншы чалавек не будзе клапаціцца пра свайго артыста так, як гэта робіць бацька для дачкі.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Пазнаёміцца з прафесіяй

ФОРМУЛА ПРЫГАЖОСЦІ

Хто распрацоўвае новыя крэмы і шампуні?

Якая дзяўчына не марыць пабываць на фабрыцы касметыкі? Наталлі КАЛБОВІЧ у гэтым плане пашанцавала: яна не толькі кожны дзень бачыць, як ствараюцца ласьёны і маскі, але і сама іх прыдумвае. Дзяўчына працуе хімікам-тэхнолагам у навукова-каардынацыйным цэнтры прадпрыемства «Беліта-Вітэкс» і апрабаваць новы сродак на сабе можа яшчэ за паўгода да таго, як ён з'явіцца на прылаўках крамаў.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Наталля Калбовіч правярае кіслотна-шчолачны баланс будучага касметычнага сродку.

ТЫСЯЧА І АДЗІН СЛОІЧАК

Наталля родам з Брэстчыны, з Мікашэвіч. У гімназіі вучылася на хіміка-біялагічным профілі. Успамінае, што спачатку хацела стаць урачом, але ў дзясятым класе з'явілася новая мара — распрацоўваць касметыку. А паколькі па гараскопе дзяўчына Казярог, то ад мэты адступаць не прывыкла. Паступіла на бюджэтнае аддзяленне ў Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, на факультэт тэхналогіі арганічных рэчываў, а пасля вучобы трапіла на прадпрыемства. Што аказалася зусім не проста.

— Трэба было прайсці гутарку і выканаць заданне: прыдумаць сродак для дэпіляцыі і ўкараніць у яго састаў нешта інавацыйнае. Прасілі распрацаваць не толькі формулу, але і маркетынгавую канцэпцыю і знешні выгляд упакоўкі. На ўсё даваўся тыдзень, а я выканала заданне за ноч. На наступны дзень тэлефаную на прадпрыемства і пытаюся: «Можна я да вас заўтра прыйду?» Там так здзівіліся! Прыйшла, расказала пра сваю прыдумку, плюс усё пераклала на англійскую мову, — дзеліцца Наталля.

Не ўсе яе аднагрупніцы пайшлі працаваць на касметычныя фабрыкі. Многія размеркаваліся на «Белмедпрэпараты», Бярозаўскі сыраробны і Тураўскі малочны камбінаты.

...Наталля запрашае ў лабараторыю. Першае, што заўважаем, — сотні слоічкаў і бутэлечак на паліцах. Малады хімік-тэхнолаг удакладняе: пры распрацоўцы касметыкі яны выкарыстоўваюць больш за тысячу найменняў сыравіны.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

Бачыць мэту!

ЯК ЗНАЙСЦІ РАБОТУ СВАЁЙ МАРЫ

і не праваліць першую гутарку са спецыялістам па падборы кадраў

«Трэба бегчы з усіх ног, каб толькі заставацца на месцы, а каб кудысьці трапіць, трэба бегчы як мінімум удвая хутчэй! — гэтую крылатую фразу з кнігі Льюіса Кэрала «Аліса ў краіне цудаў» сённяшнім студэнтам ВНУ не пашкодзіла б павесіць у сябе на сцяне як штодзённы напамін — для таго каб стаць паспяховым, трэба знаходзіцца ў пастаянным руху. Кар'ерны форум, які прайшоў у БДУ, дазволіў усім ахвотным у гэтым пераканацца. Свае прапановы наконт праходжання практыкі, стажыроўкі, а таксама вакансіі для моладзі падрыхтавалі больш як 20 айчынных і міжнародных кампаній, банкаў, Дзяржаўны пагранічны і Следчы камітэты. Спектр удзельнікаў «Кірмашу вакансій» аказаўся надзвычай шырокі: на ім былі прадстаўлены IT-фірмы, транспартна-лагістычныя, аўдытарскія, кансалтынгавыя, юрыдычныя кампаніі... Арганізатарам Кар'ернага форуму выступіла ўпраўленне кадраў БДУ.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Свае прапановы наконт праходжання практыкі, стажыроўкі, а таксама вакансіі для моладзі падрыхтавалі больш як 20 айчынных і міжнародных кампаній і банкаў.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
19 04 2018 г.

ЯК ЗНАЙСЦІ РАБОТУ СВАЁЙ МАРЫ

Самым карысным мерапрыемствам для студэнтаў стаў Speed-Meeting — хуткае інтэрв'ю з работадаўцамі.

КАНКУРЭНЦЫЯ Ў ЛІЧБАВЫМ СВЕЦЕ

— Ёсць меркаванне, што ў наступныя 5—7 гадоў больш як 80 працэнтаў людзей зменяць сваю прафесію, прычым мяняць профіль і напрамак работы ім давядзецца некалькі разоў за жыццё, — падкрэсліў у сваім выступленні адзін з хэдлайнераў мерапрыемства, **намеснік дырэктара Парка высокіх тэхналогій па маркетынгу і развіцці Аляксандр МАРЦІНКЕВІЧ.** — Тэхналогіі абнаўляюцца вельмі імкліва. У 1995 годзе на нашым рынку з'явіліся пэйджары, а ўсяго праз шэсць гадоў гэты від сувязі перастаў быць актуальны, таму што на яго месца прыйшлі мабільныя аператары. Для таго каб кампанія Google дасягнула рыначнай капіталізацыі ў 1 мільярд долараў, спатрэбілася восем гадоў. Кампаніі Tesla — чатыры гады, а кампаніі па вытворчасці акуляраў віртуальнай рэчаіснасці — усяго адзін год.

Таццяна Стрык: «Калі прыходзіце на гутарку, не хвалюйцеся, памятайце, што не толькі вас выбіраюць...»

62 гады раздзяляюць з'яўленне першага аўтамабіля і той момант, калі колькасць аўтамабілістаў дасягнула ў свеце 50 мільёнаў. Тэлефон сабраў такую аўдыторыю за 50 гадоў, тэлевізар — за 22 гады, камп'ютар — за 17 гадоў, інтэрнэт — за сем гадоў. «Фэйсбук» павялічыў сваю аўдыторыю да 50 мільёнаў карыстальнікаў за тры гады, а мабільная гульня «Pokemon Go» — за 19 дзён. Параўнайце: 62 гады і 19 дзён!

Многія тэхналагічныя кампаніі зарабляюць сёння не на прадуктах ці паслугах, а на платформах. Напрыклад, кампанія Alibaba з'яўляецца найбуйнейшай анлайн-крамай, пры гэтым у яе няма ніводнага ўласнага склада. Кампанія Uber — найбуйнейшы перавозчык, у якога няма на балансе ніводнага таксі. Кампанія «Фэйсбук» — асноўны пастаўшчык навін у свеце, але ў ёй не працуе ніводнага журналіста. Ёсць меркаванне, што праз сорак гадоў усе рабочыя месцы зоймуць робаты. Сёлета ў студзені амерыканская кампанія AMAZON адкрыла ў Сіэтле першую краму, у якой няма ні касіраў, ні прадаўцоў, ні ахоўнікаў. Уваходзячы ў гандлёвы аб'ект, пакупнікі праходзяць праз рамку, падобную да турнікета ў метро, і прыкладваюць да валідатара свой смартфон, на якім загружана праграма Amazon Go. Затым яны могуць складваць тавары з паліц адразу ў свае сумкі: патрэбы ў кошыках або каляскаў няма, бо праз касы праходзіць не трэба. Сэнсары, размешчаныя на паліцах, адразу ж дадаюць цану ўзятага тавару да агульнага кошту пакупкі або скідваюць яе, калі пакупнік кладзе тавар назад. А пры выхадзе агульная сума проста спісваецца з рахунку ў акаўнце. Галоўны плюс — поўная адсутнасць чэргаў і эканомія каштоўнага часу.

Звяртаючыся да моладзі, Аляксандр Марцінкевіч падкрэсліў: «Памятайце, што сёння на рынку працы вы канкуруеце не толькі паміж сабой, але яшчэ і з машынамі, і нейрасеткамі, і адзіная магчымасць перамагчы ў гэтай канкурэнцыі — быць больш інавацыйнымі і крэатыўнымі, у чым машыны чалавеку пакуль саступаюць. У той жа IT-галіне патрабуюцца не толькі праграмісты, матэматыкі і фізікі, як многія памылкова думаюць. Кандыдат, які валодае дадатковымі ведамі ў любой іншай сферы, — напрыклад, класны эканаміст, які атрымаў дадатковыя IT-кампетэнцыі, — уяўляе для наймальніка значна большы інтарэс. Калі прымяніць фразу з рамана Льюіса Кэрала «Трэба бегчы з усіх ног, каб заставацца на месцы» да нашага жыцця, то мая вам парада: калі вы прыходзіце на стажыроўку ці працаўладкоўваецеся ў кампанію і бачыце, што за тры месяцы выпрабавальнага тэрміну там нічога не змянілася (не з'явіўся новы прадукт, новы кірунак ці новы заказчык), то трэба спыняць любыя працоўныя адносіны з такім наймальнікам і пераходзіць у кампанію, якая бяжыць удвая хутчэй за канкурэнтаў на рынку. Абавязковая ўмова для кандыдата — веданне англійскай мовы. **У 95 працэнтах выпадкаў першы тэст, які праходзяць у кампаніях ПВТ, гэта тэст па англійскай, таму не губляйце час і вучыце замежную мову».**

РЭЗЮМЭ БЕЗ ФОТА?

Міхаіл ЛЯХ, кіраўнік TiES, правёў для студэнцкай моладзі майстар-клас па Soft Skills.

Ёсць меркаванне, што паспяховасць чалавека ў прафесійнай сферы на 85 працэнтаў залежыць ад так званых мяккіх навыкаў (soft skills). Іх яшчэ называюць сацыяльнымі, таму што размова ідзе пераважна пра ўзаемадзеянне паміж людзьмі. Маюцца на ўвазе такія чалавечыя якасці, як уменне выказваць сваё меркаванне і пры гэтым не ўшчамляць іншых, уменне весці дыялог з аўдыторыяй, аргументавана дыскутаваць, папярэджваць і «гасіць» канфлікты, фармуляваць мэты і ставіць задачы, а таксама крэатыўнасць, гнуткасць, уменне працаваць у камандзе, генерыраваць і камбінаваць ідэі, стрэсаўстойлівасць, уменне канцэнтравацца, прэзентацыйная ўпэўненасць, самаарганізацыя, гатоўнасць браць на сябе адказнасць, прыстасоўвацца да інавацый, вучыцца ўсё жыццё, таму што прафесійныя навыкі давядзецца абнаўляць пастаянна. **A soft skills спатрэбяцца ў любой сітуацыі і ў любой прафесіі.** Тое ж аратарскае майстэрства яшчэ нікому не перашкодзіла, і тое, як вы гаворыце, можа аказацца нават больш важным, чым тое, пра што вы гаворыце. Можа быць, праграмісту і не патрэбна быць крутым аратарам, але яму трэба як мінімум умець данесці свае думкі і расказаць пра свой досвед. Увогуле, калі трапляеш у новы калектыў, неабходна пастаянна павышаць сваю эфектыўнасць, быць гнуткім і лёгка адаптавацца да перамен, таму без «мяккіх навыкаў» проста не абысціся...

Спікеры (HR-менеджары, псіхолагі-практыкі, спецыялісты па невербальнай камунікацыі) раскладвалі для студэнтаў па палічках актуальныя тэмы — складанне рэзюмэ, самапрэзентацыя, капіталізацыя асабістага брэнда...

Напрыклад, што можна запісаць у графу «Вопыт працы», калі працоўнага досведу пакуль няма? Карыснай для наймальніка інфармацыяй можа аказацца, напрыклад, тэма дыплома, курсавой ці навуковай работы студэнта, калі яна, канешне, адпавядае вакансіі. Досвед фрылансу або ўдзел студэнта ў цікавых праектах...

Не сакрэт, што работадаўцы актыўна маніторацца звесткі пра прэтэндэнта ў сацыяльных сетках. Таму **трэба абавязкова прывесці ў парадак сваю старонку, праглядзець фота, перачытаць свае статусы і лішняе выдаліць ці ўстанавіць на старонцы настройкі прыватнасці...**

Студэнтаў цікавіла, ці варта размяшчаць у рэзюмэ фота: на Захадзе ад гэтай практыкі ўжо адмаўляюцца, бо знешнасць чалавека можа падсвядома ўплываць на выбар «рэкруцёраў». Аднак, як высветлілася, у нас усе звяртаюць увагу менавіта на фота, і рэзюмэ без фатаграфіі мае менш шанцаў быць заўважаным. Ну, безумоўна, калі кандыдат не прывядзе салідны пералік дасягненняў, міма якіх прайсці будзе проста немагчыма.

Упершыню да Дня кар'еры быў прымеркаваны конкурс «Відэарэзюмэ». Усе, хто зарэгістраваўся, атрымалі магчымасць на працягу двух дзён прайсці навучанне па складанні прэзентацыйнага ролика. А найлепшыя відэавізітоўкі былі прадэманстраваны на форуме падчас адкрытага паказу. Галоўная выснова — відэарэзюмэ не павінна быць сумным, зацягнутым і пераўтварацца ў самапрэзентацыю, каб яго дагледзелі да канца. Кандыдату трэба зачапіць увагу наймальніка, расказаўшы, чым менавіта ён можа быць яму карысны.

РАЗМОВА НА РОЎНЫХ

Але бадай што самым карысным мерапрыемствам для студэнтаў стаў Speed-Meeting (хуткае інтэрв'ю) з работадаўцамі — так бы мовіць, рэпетыцыя будучай гутаркі з патэнцыяльным наймальнікам. У якасці рэкруцёраў выступалі спецыялісты па падборы персаналу з самых розных кампаній — ад аўтамабільнага холдынга і сеткі гіпермаркетаў, да IT-кампаній і юрыдычных фірмаў.

Хасан Ахмедаў з Узбекістана навучаецца на спецыяльнасці «медыцынская электроніка» ў БДУІР. Да гэтага паспеў на радзіме закончыць з адзнакай медыцынскі каледж. Валодае нямецкай і англійскай мовамі і працягвае ўдасканальваць свае веды ў замежных мовах, навучаецца на курсах, наведвае шматлікія трэнігі, стартап-школы, захапляецца інтэлектуальнымі гульнямі, мае вопыт валанцёрскай дзейнасці. Прызнаецца, што па першым часе адчуваў сябе адзінокім у чужой краіне, але потым узяў ініцыятыву на сябе і зараз у яго шмат знаёмых і сяброў. У сваім рэзюмэ ён паведаміў, што без праблем знаёміцца з людзьмі і ўстанаўлівае як звычайныя, так і дзелавыя кантакты. Яго моцныя бакі — уважлівасць, аналітычны склад розуму, адказнасць, адкрытасць да ўсяго новага, хуткая навучальнасць, пастаянна праца над сабой, мэтанакіраванасць — «дамагаюся свайго і не супакоюся, пакуль не давяду справу да канца».

— Тое, што вы пераадолелі цяжкасці і набылі сяброў, вельмі важная інфармацыя для работадаўца, — кансультуе хлопца **намеснік дырэктара рэстарана-піваварні «Сябры» па персанале Таццяна СТРЫК.** — У вас вельмі добрая прэзентацыя і рэзюмэ. І веданне замежных моў наймальнікам таксама вельмі цэніцца. Прызнаюся, што кожны рэкруцёр падбірае персанал, прыемны для сябе — гэта чалавечы фактар. Калі ён, напрыклад, цэніць інтэлігентнасць, выхаванасць, уменне сябраваць, шырокі кругагляд, і ўсе гэтыя якасці бачыць у кандыдаце, гэта адразу вялікі плюс на яго карысць. Яшчэ 50 працэнтаў — гэта патрабаванні кампаніі да дзелавых якасцяў. Я, напрыклад, даўно працую ў сістэме грамадскага харчавання і выбіраю людзей, якія ўмеюць кантактаваць, з добра развітай здольнасцю да эмпатыі — уменнем суперажываць эмацыянальнаму стану іншага чалавека. Для нашай сферы гэта вельмі важныя якасці.

Калі праглядаеш рэзюмэ, заўсёды глядзіш, дзе кандыдат раней працаваў. Хачу папярэдзіць, што трэба быць заўсёды лаяльным да свайго папярэдняга работадаўца, нельга выказвацца пра яго негатыўна, больш прадуктыўна казаць толькі добрае, напрыклад, што вы набылі на папярэднім рабочым месцы, чаму навучыліся — кожны наймальнік гэта ацэніць. Калі прыходзіце на гутарку, не хвалюйцеся, памятайце, што не толькі вас выбіраюць, але і вы выбіраеце для сабе месца працы. І калі вам непрыемныя пытанні, што задаюць, не падабаецца стаўленне да вас, дайце зразумець, што вы знаходзіцеся на роўных. **Не толькі кампанія падбірае для сябе спецыяліста, але і вы прадаяце свае ўменні, навыкі і сваю энергію... Не трэба падладжвацца, але і завышаць амбіцыі таксама не варта. Калі вам падабаецца кампанія, то пачынайце з той пасады, якую прапануюць, калі, зразумела, гэта не супярэчыць вашым прынцыпам і жыццёвай пазіцыі.**

А ўжо потым будзеце рухацца ўверх па кар'ернай лесвіцы. Калі ж падчас стажыроўкі зразумелі, што здзейснілі памылку з выбарам, штосьці вас не задавальняе, вашы навыкі і кампетэнцыі не задзейнічаны ў поўнай ступені, то трэба ўсё шчыра сказаць работадаўцу: гэта каштоўны вопыт не толькі для вас, але і для яго.

І яшчэ адна парада: здараецца, што чалавек празмерна захапляецца бізнес-гульнямі і трэнінгамі, таму яго чаканні ад работы могуць не супадаць з рэчаіснасцю.Такі работнік хутка страчвае інтарэс, а трэба мець цярплівасць і быць гатовым у тым ліку і да руціннай працы. Існуе перыяд адаптацыі, які трэба перажыць. Пры гэтым развіццё і прафесійнае ўдасканаленне з парадку дня ніхто не знімае...

Надзея НІКАЛАЕВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

► У ТЭМУ

Карысць ад... пяхотнай рыдлёўкі

Больш як 10 тысяч станоўчых адзнак і сотні каментарыяў набраў пост у расійскай інтэрнэт-прасторы, які цытаваў крэатыўнае рэзюмэ аднаго з кандыдатаў на пасаду праграміста.

Прэтэндэнт у графе «Досвед работы» ўказаў, што год працаваў праграмістам у Міністэрстве абароны, дзе займаўся «нейралінгвістычным праграмаваннем асабовага складу» і «вывучаў зямную кару пры дапамозе МПР-50».

«Толькі калі я «загугліў» МПР-50, да мяне нарэшце дайшло, што гэты знаходлівы чалавек так апісаў службу ў войску!» — паведаміў аўтар публікацыі, удакладніўшы, што МПР-50 — гэта малая пяхотная рыдлёўка даўжынёй 50 сантыметраў.

Творчы падыход да складання рэзюмэ выклікаў бурнае абмеркаванне на партале. Карыстальнікі назвалі суіскальніка «шыкоўным чэлам» і пашкадавалі, што спецыялісты па прыёме на работу наўрад ці ацэняць крэатыўнасць кандыдата.

ФОРМУЛА ПРЫГАЖОСЦІ

За пяць гадоў дзяўчына паспела распрацаваць больш за паўтары сотні новых прадуктаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Першым маім заданнем было рассартаваць сыравіну і такім чынам азнаёміцца з гандлёвымі назвамі. Бо адзін кампанент можа быць пад рознымі «імёнамі». Свабодна арыентавацца ў лабараторыі пачала месяцы праз два. Потым мне сталі прапаноўваць уласныя праекты. Першае заданне — распрацоўка настою для ваннаў. Тады мне здавалася, што гэта вельмі складана. На жаль, гэты мой праект так і не рэалізавалі. А вось наступны — густое мыла для лазні — выйшаў у свет.

ТВОРЧАСЦЬ І ЭКАНАМІЧНЫ РАЗЛІК

— Давайце пакажу, як робіцца крэм, — прапануе Наталля.

Для гэтага хімік-тэхнолаг рыхтуе дзве фазы — водную і тлушчавую. Для апошняй выкарыстоўваюцца розныя маслы, напрыклад вінаградная костачкі, арэха макадамія, арганы. Маслы дэзадараваныя, гэта значыць, нічым не пахнуць, — водар у касметычнага сродку з'яўляецца толькі пасля дабаўлення парфумернай кампазіцыі. Калі трэба, каб крэм увільгатняў скуру, у яго можна дадаць гіалуронавую кіслату, экстракты водарасцяў, каб амалоджваў — пептыды, фосфаліпіды.

Малады хімік-тэхнолаг удакладняе: пры распрацоўцы касметыкі яны выкарыстоўваюць больш за тысячу найменняў сыравіны.

Пасля таго як усе кампаненты наліты, спецыяліст спалучае дзве фазы. З дапамогай лабараторнай тэхнікі гэты састаў перамешваецца і гамагенізуецца (робіцца аднародным). Усё, крэм гатовы.

За пяць гадоў, што Наталля на прадпрыемстве, яна паспела распрацаваць больш за паўтары сотні новых прадуктаў. Гэта і крэмы супраць старэння, і маскі для валасоў і твару, і солі для ваннаў, і гелі для душу. У «партфоліа» дзяўчыны ёсць нават зубная паста і рэпелентны сродак.

Як увогуле прыдумляецца новая касметыка?

— Гэта творчы працэс, — заўважае дзяўчына. — Над стварэннем новай лініі шчыруе каманда з розных спецыялістаў. Я арыентуюся на сучасныя тэндэнцыі і пажаданні патэнцыйных пакупнікоў. Перад тым як прыступіць да практыкі, прапрацоўваю пытанне ў тэорыі. Аналізую, якія кампаненты лепш падыдуць.

На распрацоўку прадукта ў спецыяліста ідзе паўтара-два месяцы. Каб атрымаць належную формулу, часам трэба перабраць да 15—20 варыянтаў! Увесь працэс — ад зацвярджэння новых прадуктаў да іх выпуску займае каля шасці-васьмі месяцаў.

Цікавімся, на кім тэстуюць прыдуманыя маскі і гелі. Аказваецца, першы, хто іх выпрабоўвае, гэта сам распрацоўшчык. Касметыку правяраюць у лабараторыі пры дапамозе інструментальных метадаў, а таксама на валанцёрах, з улікам водгукаў якіх можна адкарэктаваць рэцэптуру.

На паліцах у лабараторыі — каля тысячы кампанентаў.

ХІМІЧНЫ — НЕ ЗНАЧЫЦЬ ШКОДНЫ

Адзін з плюсоў работы — замежныя камандзіроўкі з мэтай павышэння кваліфікацыі. Летась Наталля ездзіла ў Францыю ў кампанію, якая вырабляе экстракты і актыўныя кампаненты з водарасцяў, і ў Германію на прадпрыемства па выпуску сіліконаў. Рэгулярна бывае на навучальных семінарах і выставах у Маскве.

Водар у касметычнага сродку з'яўляецца толькі пасля дабаўлення парфумернай кампазіцыі.

Тры гады таму дзяўчына ўдзельнічала ў міжнародным конкурсе, які праводзіў еўрапейскі хімічны канцэрн BASF — у спецыяльнай намінацыі для тэхнолагаў. Трэба было распрацаваць дзённы крэм з абаронай ад ультрафіялету. Беларуска справілася з заданнем на выдатна і заняла першае месца сярод больш чым 20 удзельнікаў з краін СНД.

А ці шмат касметыкі ў той, хто яе прыдумвае? Наталля адказвае, што ўласныя запасы займаюць усяго дзве палічкі ў ванным пакоі. 70—80 працэнтаў — сродкі, якія яна сама распрацавала: дзяўчына любіць тэставаць тое, што ў выніку атрымалася. Набывае і замежную касметыку, але хутчэй з прафесійнага інтарэсу.

Пытаемся, а якія сродкі яна не купіла б?

— Я не ўзяла б касметыку, у якой не ўтрымліваецца кансервантаў. Бо не ведаю, ці былі вытрыманы ўмовы яе захоўвання. А тэрмін прыгоднасці ў такіх сродкаў не большы за тры месяцы, — дзеліцца дзяўчына. — Не купляю таксама касметыку, калі бачу, што састаў не адпавядае канчатковаму кошту прадукту.

Апошнім часам расце папулярнасць арганічнай касметыкі. Кожны год яе продажы павялічваюцца на 10—15 працэнтаў. Цікавімся: гэтыя сродкі насамрэч больш эфектыўныя ці справа ў модзе?

— Арганічная касметыка — гэта не проста кірунак індустрыі прыгажосці, а цэлая філасофія. Натуральным у ёй павінна быць усё — ад самога прадукту да ўпакоўкі. Трэнд стаў папулярны дзякуючы прапагандзе здаровага ладу жыцця, захаванню экалогіі, што ў цэлым цудоўна, — лічыць хімік-тэхнолаг. — А вось наконт большай эфектыўнасці я не сказала б. Напрыклад, многія актыўныя малекулы, якія добра спраўляюцца з узроставымі змяненнямі скуры, праявамі цэлюліту, з'яўляюцца вынікам хімічнага сінтэзу. А кампаненты натуральнага паходжання, з якіх на 90 працэнтаў складаецца арганічная касметыка, могуць выклікаць алергічную рэакцыю.

Аб сваім выбары прафесіі Наталля ні разу не пашкадавала. «Мне вельмі падабаецца мая работа, — усміхаецца. — Люблю рабіць людзей больш прыгожымі».

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Рыхтуем водную фазу для крэму.

Ідэі маладых

Перамога найлепшых, трыумф крэатыўных

У сталіцы адбыўся фінал рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі», арганізатарам якога выступае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Па выніках сёмага сезона ў гранд-фінал увайшлі 119 аўтарскіх распрацовак.

Праекты былі прадстаўлены ў 16 намінацыях у трох узроставых групах. Найлепшыя распрацоўкі адзначылі дыпломамі, а таксама прыемнымі бонусамі, сярод якіх былі рэкамендацыі Цэнтральнага камітэта ГА «БРСМ» для паступлення ў ВНУ, запрашэнні на курс для бізнесменаў-пачаткоўцаў і ў школу «Малады навуковец пад ключ», сертыфікаты на прасоўванне праекта і абарону інтэлектуальнага прадукту, бясплатнае навучанне ў стартап-акселератары, рэгістрацыя фірмы і размяшчэнне праекта на працягу года на базе бізнес-інкубатара, а таксама грашовая падтрымка — да 40 тарыфных ставак.

Адметнасцямі гэтага сезона сталі ўдзел у праекце людзей з абмежаванымі магчымасцямі на агульных падставах, а таксама новыя намінацыі — «Інклюзіўная прастора» і «Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі для людзей з інваліднасцю». Акрамя таго, асаблівай папулярнасцю сярод удзельнікаў карысталіся «Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі» і «Медыцына, фармацыя, медыцынская тэхніка». Мы пагутарылі з адным з канкурсантаў, які прадстаўляў сваю распрацоўку менавіта ў апошняй намінацыі.

— Ідэя праекта нарадзілася ў мяне, яшчэ калі вучыўся ва ўніверсітэце, — расказвае стваральнік праграмы «MedicalDiagnostics» Аляксандр ВАШЧУЛА з Жодзіна. — На занятках па інфекцыйных хваробах нам далі заданне: трэба было вызначыць узбуджальніка з дзесяці магчымых (усе захворванні былі з падобнымі сімптомамі). Гэта было насамрэч цяжка. І вось тады я вырашыў стварыць агульную базу, у якую будуць унесены сімптомы, і сярод некалькіх дзясяткаў узбуджальнікаў яна выдасць патрэбны.

Да працы прыступіў праз паўтара года, калі вучыўся ў інтэрнатуры. На камп'ютары стварыў прэзентацыю, дзе распісаў, як гэта павінна выглядаць. З ёй дайшоў да паўфіналу, а пасля зусім выпадкова знайшоўся праграміст, які пагадзіўся дапамагчы мне на адным толькі энтузіязме.

Сёння база праграмы невялікая — уключае ўсяго восем хвароб сістэм органаў дыхання. Але ўжо зразумела, як яна будзе працаваць, калі іх будзе сто і больш.

Дарэчы, перад фіналам я дапрацаваў праграму. Яна таксама дае магчымасць развіваць так званую тэлемедыцыну: калі ўрач знаходзіцца на адлегласці ад пацыента, але тым не менш можа правесці кансультацыю і выпісаць электронны рэцэпт, што ўжо зараз актыўна ўкараняецца на тэрыторыі нашай краіны.

Маім праектам зацікавілася адна расійская кампанія. Мы працуем над тым, каб мінімізаваць працэнт памылак у праграме дзякуючы больш складанаму алгарытму выстаўлення дыягназу, які будзе заснаваны на тэарэме Баеса — адной з асноўных тэарэм элементарнай тэорыі імавернасцяў.

Лічу, што распрацоўка «MedicalDiagnostics» знізіць нагрузку на ўрачоў, павысіць якасць абслугоўвання пацыентаў і зменшыць выдаткі дзяржавы на ўтрыманне ложка-месца ў бальніцы.

Ганна БАГІНО.

Зручнае і дружалюбнае

Студэнцкі праект БДУ «Экаўгнаенні для ўстойлівага развіцця сельскай гаспадаркі і зялёнай эканомікі» стаў абсалютным пераможцам у намінацыі «Аграпрамысловыя тэхналогіі і вытворчасць» на Рэспубліканскім маладзёжным конкурсе «100 ідэй для Беларусі». Яго аўтарамі выступілі трэцякурснікі хімічнага факультэта Лізавета Сяргеева-Някрасава і Максім Мацавіла. Таксама ў каманду распрацоўшчыкаў увайшла дзесяцікласніца сталічнай гімназіі № 6 Яна Дрозд.

Ідэя, прапанаваная маладымі даследчыкамі, скіравана на вытворчасць зручных у выкарыстанні экалагічных угнаенняў. Працэс безадходны і заснаваны на прымяненні біяраскладальнай, цалкам растваральнай у вадзе плёнкі, распрацаванай у лабараторыі Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем БДУ.

Спецыяльна спакаваныя гранулы мікраўгнаенняў палягчаюць догляд раслін, зніжаюць рызыку няправільнага ўвядзення падкормкі ў глебу і скарачаюць частату паліву за кошт паступовага вызвалення дзейных элементаў і павольнага растварэння плёнкі.

У якасці асноўных кампанентаў угнаення выступаюць адходы буйнатанажных вытворчасцяў. У прыватнасці, лігнін назапашаны ў цяперашні час у адвалах у колькасці больш за тры мільёны тон. Таксама ў склад уваходзіць сумесь мона- і дыгідрафасфату калію. Дадзены састаў фарміруе канкурэнтныя перавагі інавацыі і забяспечвае яе эканамічную даступнасць.

Угнаенні былі пратэсціраваныя ў Інстытуце глебазнаўства і аграхіміі НАН Беларусі і Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміяй. Было здзейснена аграхімічнае культываванне на глебах азімых, яравых збожжавых культур і кукурузы, а таксама на агародніне ў закрытым грунце. Паўсюдна адбылося павелічэнне ўсіх якасных паказчыкаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
19 04 2018 г.

Сёння мы працягваем публікацыю найлепшых работ, якія паступілі на наш конкурс юных і маладых нештатных аўтараў. Творчае спаборніцтва набірае абароты! «Проб пяра» становіцца ўсё больш, канкурэнцыя сярод патэнцыйных пераможцаў расце! Хто яшчэ гатовы прыняць выклік? Далучайцеся, пакуль ёсць час, не адцягвайце з адпраўленнем сваіх работ. Зрэшты, нагадаем заўсёднае: прайграўшых у нашым конкурсе не бывае. Творчы досвед, парада прафесійных журналістаў, публікацыя на старонках рэспубліканскага выдання па-сапраўднаму вартай «пробы пяра» — гэта, пагадзіцеся, таксама не мала для пачаткоўцаў.

Нагадваем, па выніках конкурсу пераможцы атрымаюць памятныя прызы. Тым з іх, хто сёлета збіраецца паступаць на факультэт журналістыкі, рэдакцыя дасць яшчэ і рэкамендацыі. Конкурс будзе доўжыцца да 1 мая (дата адпраўлення матэрыялаў). Найлепшыя творчыя работы (у залежнасці ад колькасці, якая паступіць) «Чырвонка. Чырвоная змена» будзе працягваць друкаваць і надалей, пасля вызначэння пераможцаў. Вынікі плануецца падвесці да пачатку ўступнай кампаніі.

У свет танца з «Навігатарам»

Пінская школа-студыя сучаснага танца «Навігатар» на сённяшні момант з'яўляецца не толькі адной з вядучых у нашай краіне, але яшчэ і адной з самых тытулаваных. Сакрэт поспеху раскрыў яе кіраўнік — Ігар Прахаровіч.

У канцы 1990-х гадоў усіх захліснула хваля брэйк-данса. На дыскатэках, у школах, на вуліцах хлопцы і дзяўчаты танцавалі ў гэтым новым для сябе напрамку. Брэйк быў вельмі модны. Моладзь стварала каманды, прыдумвала ім назвы, арганізоўвала батлы — спаборніцтвы паміж танцорамі.

Як і любому хлапчуку, Ігару хацелася асвоіць некалькі элементаў, тым больш яму вельмі падабалася музыка, пад якую танцавалі. У той момант малады чалавек быў сур'ёзна захоплены спортам, асабліва лёгкай атлетыкай. Ён з'яўляецца чэмпіёнам Пінска, а таксама прызёрам розных абласных спаборніцтваў. Зараз Ігар прызнаецца: «Калі б мне хтосьці тады сказаў, што праз пятнаццаць гадоў я буду кіраваць адной з вядучых студый танца, я б доўга смяяўся».

Нягледзячы на адсутнасць педагогаў, Ігар з сябрамі самі асвоілі брэйк. А пазней разам з Кірылам Сухабокавым сталі выкладаць у «Навігатары», у які спачатку прыйшлі як простыя танцоры.

У 2007 годзе асновы вулічных танцаў у студыі асвойвалі ўсяго трыццаць хлопчыкаў і дзяўчатак. Першы поспех да іх прыйшоў ужо ў 2009 годзе на міжнародным фестывалі краін СНД і Балтыі. Тады выхаванцы «Навігатара» перамаглі адразу ў дзвюх намінацыях.

У верасні 2010 года на базе студыі была арганізавана школа танца «Навігатар» і школа брэйк-данса з такой жа назвай. Акрамя брэйка, там танцуюць хіп-хоп і эстрадны танец. Дарэчы, на цяперашні момант у танцавальнай школе займаюцца дзеці розных узростаў: ад пяці да васямнаццаці гадоў, усяго сто семдзесят чалавек. У Пінску амаль кожнае дзіця, якое цікавіцца танцамі, марыць займацца ў знакамітым «Навігатары».

Перамогі для выхаванцаў студыі — заканамернасць, бо танцы для гэтых хлопцаў і дзяўчат не проста хобі, а сур'ёзны занятак, якому яны аддаюцца без астатку. Сёння кожны танцор мае магчымасць удзельнічаць у конкурсах, наведваць разнастайныя майстар-класы. Дзеці прыходзяць у «Навігатар» і знаходзяць сабе сяброў, з ранніх гадоў вучацца ставіць мэты, упарта ісці да іх і дасягаць.

У скарбонцы танцавальнай школы сотні перамог. Выхаванцы студыі заўсёды з годнасцю прадстаўляюць нашу краіну і родны горад на міжнародным узроўні. Яны ўжо паспяхова выступілі ў Расіі, Украіне, Эстоніі, Латвіі, Польшчы і Славакіі. Пяцьдзясят восем разоў паднімаліся на найвышэйшую ступень п'едэстала і больш за сорак разоў станавіліся прызёрамі розных чэмпіянатаў і фэстаў. А ў 2015 годзе «Навігатар» увайшоў у топ-16 найлепшых камандаў свету разам з самымі «танцавальнымі» нацыямі: бразільцамі і мексіканцамі.

Як ні круці, а поспехі дзяцей — гэта яшчэ і заслуга настаўнікаў — маладых, таленавітых і адказных. У студыі тры трэнеры: Ігар Прахаровіч, Кірыл Сухабокаў і адзін навічок, былы выхаванец «Навігатара» Ілья Сачкоўскі.

Ігар Прахаровіч у 2017 годзе стаў лаўрэатам гарадской прэміі за ўклад у развіццё маладзёжнай палітыкі, а таксама ўвайшоў у склад судзейскай калегіі грамадскага аб'яднання «Беларуская ліга танца» і ў склад Савета праўлення Беларускай федэрацыі брэйк-данса, уганараваны падзякай Міністэрства адукацыі за ўклад у развіццё маладзёжнай культуры.

Другі трэнер Кірыл Сухабокаў уключаны ў склад судзейскай калегіі Рэспубліканскага маладзёжна-грамадскага аб'яднання «Беларуская федэрацыя брэйк-данса». Настаўнікі танцавальнай школы ў красавіку плануюць правесці рэспубліканскі фестываль сучаснага танца «Moving up» у Пінску.

У сакавіку гэтага года «Навігатар» адзначыў першы юбілей — дзесяць гадоў. У Пінскім гарадскім Доме культуры быў арганізаваны вялікі святочны канцэрт. Падтрымаць любімую студыю прыйшло столькі людзей, што ў зале не было месца нават у праходах. Усё гэта яшчэ раз пацвярджае, што «Навігатар» задаў правільны напрамак.

Дар'я БАХІР,
вучаніца 11 класа СШ № 15 г. Пінска.

❍ ПРА АЎТАРА

Дар'і 17 гадоў, журналістыкай яна займаецца ўжо трэці год. Зараз піша матэрыялы ў асноўным для гарадской газеты.

— Рыхтуюся да паступлення ў Інстытут журналістыкі БДУ, вывучаю гісторыю Беларусі, рускую, беларускую, англійскую мовы, — дзеліцца планамі дзяўчына. — Праца карэспандэнтам захапляе мяне сваёй рознабаковасцю, актыўнасцю і заўсёды — непрадказальнасцю. Уражвае тое, наколькі розныя і таленавітыя бываюць людзі!

У конкурсе «Я — малады. І мне не ўсё роўна!» Дар'я ўжо ўдзельнічала двойчы, у 2016 годзе стала адным з яго пераможцаў.

Колеры натхнення і выразнасці

«Ура! Павел Іванавіч прыйшоў! Будзем маляваць!» — так дзеці сустракаюць кіраўніка гуртка «Вясёлкавая палітра» Паўла Шантарыцкага. У пачатку навучальнага года ён далучыўся да тых, хто арганізуе вольны час школьнікаў у Маладзечанскім цэнтры творчасці дзяцей і моладзі «Маладзік». Навучэнцы бачаць у ім не толькі педагога, але і сябра, з якім можна падзяліцца любым сакрэтам. Яны з цікавасцю слухаюць, назіраюць за кожным яго дзеяннем і імкнуцца пераймаць яго вопыт.

— Настаўнік павінен разумець дзяцей, прадбачыць, як яны стануць паводзіць сябе ў той ці іншай сітуацыі, быць уважлівым да ўсіх без выключэння, — лічыць Павел. — Важна знаходзіцца з імі «на адной хвалі», але ў той жа час не забываць пра навучанне.

За некалькі месяцаў вучні маладога педагога засвоілі, што такое полымя, святло, цень, каляровы пераход. Навучыць дзяцей маляваць прасторавыя фігуры няпроста. Павел Іванавіч стараецца даступна растлумачыць тыя складаныя паняцці, якія ён яшчэ нядаўна сам спасцігаў у гімназіі-каледжы мастацтваў.

— Калі я прыношу на заняткі свае малюнкі, дзеці з вялікай цікавасцю разглядаюць іх, — расказвае педагог.

Павел малюе ў розных жанрах, але аддае перавагу графіцы, таму што трыма колерамі (чорным, шэрым і белым) можна больш выразна паказаць аб'ём. Аднак найлепшай сваёй работай лічыць дыпломную з выявай касцёла Найсвяцейшай Дзевы Марыі, які стаіць на пагорку ў вёсцы Хоўхлава.

— У дзяцінстве мы з бацькамі часта ездзілі на дачу і кожны раз праязджалі міма храма. Мяне, тады яшчэ маленькага хлопчыка, заўсёды заварожвалі яго магутнасць і маштаб, — успамінае малады мастак. — Кожная дэталь карціны сімвалічная. Касцёл — гэта я, аблокі — тое зло, якое хоча праглынуць мяне, а святло, што прабіваецца скрозь хмары, мяне ратуе.

Такое апісанне дыпломнай работы можа належаць толькі сапраўды творчаму чалавеку. І на самай справе, жывапіс — гэта толькі адно са шматлікіх хобі Паўла. Сярод іх знайшлося месца і фатаграфіі. Інтарэс да фотамастацтва ўзнік у дзяцінстве. У прыцэл яго камеры часцей за ўсё трапляюць цікавыя людзі.

— Калі мне спадабалася асоба, — гаворыць Павел, — то я запрашаю чалавека на фотасесію і стараюся перадаць яго ўнутраны свет праз серыю партрэтных здымкаў.

У «партфоліа» фатографа мноства пейзажаў. Асабліва ён любіць захад сонца. У яго больш за дзесяць выяў адыходзячага дня, і кожная з іх непаўторная. Яшчэ Рэй Брэдберы казаў: «Мы таму і любім захад, што ён бывае толькі адзін раз у дзень».

Малады чалавек аддае перавагу не лічбаваму, а плёначнаму фотаапарату.

❍ ПРА АЎТАРА

Спачатку Ірына хацела стаць доктарам, каб дапамагаць людзям. Потым, наведаўшы дэльфінарый, стала марыць аб прафесіі дрэсіроўшчыка. Затым у яе з'явілася імкненне скончыць БДПУ імя М. Танка, каб, як і яе любімыя педагогі, вучыць дзяцей.

— Але аднойчы я зразумела, што мяне цікавіць журналістыка. Пазнаёміўшыся бліжэй з гэтай прафесіяй, я знайшла ў ёй тое, што сапраўды для мяне блізка і важна. Яна адна з нямногіх дазваляе чалавеку не стаяць на месцы і быць у цэнтры ўсяго таго, што адбываецца навокал, — лічыць 17-гадовая аўтарка.

Застаецца дадаць, што Іра — адна з трох пераможцаў нашага мінулага творчага конкурсу.

— Калі ты бярэш у рукі рарытэтны «Зеніт», то працэс здымкі і праяўлення фатаграфій ператвараецца ў сапраўдны рытуал, — прызнаецца наш герой.

На думку Паўла, для фатографа галоўнае не зацыкліваца на нейкім адным аб'екце, а пастаянна рухацца наперад і шукаць сябе. Фатаграфія патрабуе не столькі прафесіяналізму, колькі натхнення, атмасферы і ўмення злавіць «той самы момант».

А яшчэ малады чалавек шукае сябе ў музыцы, піша кампазіцыі, сумяшчаючы розныя стылі: Techno, DeepTechno і House. Нядаўна ў адной з мясцовых кавярняў кампазітар-пачатковец прэзентаваў вынік сваёй працы.

— Сярод музыкантаў прыкладам для мяне з'яўляецца еўрапейскі дыджэй Amelie Lens, якая піша ў Techno. A David Guetta і Avici падабаюцца мне сваёй мелодыкай, — прызнаецца юнак.

Але бываюць моманты, калі бунтарскае сэрца просіць экстрыму. І тады наш герой становіцца на скейтборд, можа гадзінамі асвойваць новы элемент, пакуль той не атрымаецца. Гэта цудоўна, што ў любой справе, за якую бярэцца Павел Шантарыцкі, ён імкнецца расці і развівацца!

Ірына БУБНОВА,
вучаніца 11 класа СШ № 12 г. Маладзечна.

«PRAвакацыя» на... добры настрой

Некалькі гадоў таму маладзечанскі школьнік Марк Войтка ўжо даваў інтэрв'ю для «Чырвонкі. Чырвонай змены». Тады ў яго былі амбіцыйныя мэты і планы, многія з якіх удалося ажыццявіць. Цяпер Марк і яго сябар Арцём Саладуха з'яўляюцца ўдзельнікамі групы «PRAвакацыя». Дзякуючы таленту юнакоў і іх прадзюсара кампазітара Анатоля Чэпікава, за тры гады калектыў набыў свой «твар» і стаў даволі вядомы на беларускай эстрадзе. Выступленне гурта — заўсёды свята для гледачоў. Публіка ахвотна падпявае любімым артыстам і нават прытанцоўвае ў такт музыцы.

— Сваімі песнямі мы правакуем людзей на добры настрой і «гарачыя» танцы. Менавіта так можна растлумачыць назву нашай групы, — расказвае Марк Войтка. — Акрамя таго, «PRO» ўказвае на прафесіяналізм нашай каманды, а слова «вакацыі» ў перакладзе з беларускай мовы азначае «канікулы».

Першы год Арцём і Марк старанна працавалі над рэпертуарам, запісваючы ў студыі песні. Кампазіцыя, з якой пачынаў гурт, называлася «Ласкай». Менавіта з ёй хлопцы дэбютавалі ў конкурсе «Песня года Беларусі».

Зараз у іх рэпертуары каля трыццаці песень на трох мовах. Адну з іх — «Ты будзеш першым» — называюць сапраўдным гімнам усіх спартыўных мерапрыемстваў краіны. А з кампазіцыяй на грэчаскай мове група прымае ўдзел у «Фестывалі нацыянальных культур».

— Мы яшчэ да канца не змаглі вызначыцца, у якім стылі хацелі б працаваць. Музычныя трэнды змяняюцца кожную хвіліну. У цэлым наш кірунак можна смела называць поп-музыкай, — гаворыць Марк.

Акрамя запамінальнага рэпертуару, юнакі здзіўляюць гледачоў сваімі яркімі касцюмамі. Іх стварэннем займаюцца прафесійныя стылісты. Аднак генерыраваць ідэі ім дапамагае ўдзельнік групы Арцём Саладуха, які, акрамя музыкі, цікавіцца яшчэ і модай. Самы першы канцэртны касцюм у выглядзе панцыраў — цалкам яго задумка, якую дапамагла ўвасобіць дызайнер Наталля Ляхавец. Дарэчы, ідэю годна ацаніла і прафесійнае журы — дзякуючы гэтым касцюмам хлопцы сталі ўладальнікамі Нацыянальнай музычнай прэміі «Ліра» ў намінацыі «Стыль года».

Летась гурт прымаў удзел у фінале адборачнага тура на «Еўрабачанне-2017». Тады карыстальнікі сацыяльных сетак назвалі «PRAвакацыю» з яе песняю «Feel My Heart» адным з фаварытаў адбору, але журы, на жаль, іх не падтрымала і зрабіла іншы выбар.

— Цікавы вопыт, добры інфармацыйны штуршок. Уклалі шмат працы, ішлі не проста так — ішлі перамагаць, — дзеляцца ўражаннямі юнакі.

Цяпер салісты паспяхова сумяшчаюць работу з вучобай (хлопцы з'яўляюцца студэнтамі чацвёртага курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў), запісваюць новыя песні, здымаюць на іх кліпы, якія транслююцца на тэлеканалах і актыўна разыходзяцца ў інтэрнэце. Група прызнаная лепшым беларускім поп-гуртом 2016 года па версіі тэлеканала «RU TV Беларусь».

— Музыка ў нашым жыцці — гэта ўсё. Музыка — гэта і праца, і жыццё. Яна з намі ўсюды: на адпачынку, дома. Мы і музыка — нераздзельныя, — гавораць юнакі.

Сёння група — жаданы госць на мерапрыемствах рознага ўзроўню — ад школьнага або студэнцкага выпускнога да сур'ёзнага карпаратыўнага мерапрыемства або ўрачыстага канцэрта.

Глеб РУДЗЬКО,
вучань 9 класа сярэдняй школы № 14 г. Маладзечна.

❍ ПРА АЎТАРА

Па шчырасці, удзельнікаў-хлопчыкаў у нашым творчым конкурсе за пяць гадоў было няшмат. Апошнія разы — увогуле ніводнага. Таму прыемна, што сёлета паспрабаваць свае сілы ў ім вырашыў 14-гадовы Глеб.

Па словах самога аўтара, у яго шмат розных захапленняў: вакал, танцы, журналістыка. Акрамя таго, хлопец захапляецца вырабам... тартоў.

— Вы, мабыць, падумалі, што калі ў мяне столькі хобі, я не паспяваю вучыцца? Вядома ж, паспяваю, бо вучоба — гэта веды, якія спатрэбяцца ў далейшым. Сярэдні бал у мяне — 8,6, — кажа Глеб. — Любімыя прадметы — мова і літаратура.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 31 декабря 2017 года

Организация	Открытое акционерное общество «Агролизинг»
Учетный номер плательщика	190738158
Вид экономической деятельности	Финансовый лизинг
Организационно-правовая форма	Открытое акционерное общество
Орган управления	Юридическое лицо без ведомственной подчиненности
Единица измерения	тыс. руб.
Адрес	220005, г. Минск, ул. Красная, 13-31

Активы	Код строки	На 31 декабря 2017 года	На 31 декабря 2016 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	2 410	946
Нематериальные активы	120	3	3
Доходные вложения в материальные активы	130	2 142	1 340
в том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	786	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	1 356	1 340
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	-	-
Долгосрочные финансовые вложения	150	6 111	17
Отложенные налоговые активы	160	-	1
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	68 858	26 380
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**79 524**	**28 687**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	15	13
в том числе:			
материалы	211	15	13
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	-	-
готовая продукция и товары	214	-	-
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	77
Расходы будущих периодов	230	16	1 628
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	7 363	-
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	114 132	83 658
Краткосрочные финансовые вложения	260	105	4 936
Денежные средства и эквиваленты денежных средств	270	4 390	7 132
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
ИТОГО по разделу II	**290**	**126 021**	**97 444**
БАЛАНС	**300**	**205 545**	**126 131**

Собственный капитал и обязательства	Код строки	На 31 декабря 2017 года	На 31 декабря 2016 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	15 000	15 000
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	45	35
Добавочный капитал	450	628	691
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	40 311	12 256
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**55 984**	**27 982**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	53 569	27 078
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	5 152	-
Доходы будущих периодов	540	12 452	6 515
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	9 161	2 568
ИТОГО по разделу IV	**590**	**80 334**	**36 161**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	229	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	16 976	1 951
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	16 801	7 078
в том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	10 403	34
по авансам полученным	632	5 803	5 523
по налогам и сборам	633	-	957
по социальному страхованию и обеспечению	634	-	-
по оплате труда	635	-	-
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	-
прочим кредиторам	638	595	564
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	27 755	47 147
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	7 466	5 812
ИТОГО по разделу V	**690**	**69 227**	**61 988**
БАЛАНС	**700**	**205 545**	**126 131**

ОТЧЕТ о прибылях и убытках за январь – декабрь 2017 года

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2017 г.	За январь – декабрь 2016 г.
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	10 381	12 123
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(1 525)	(365)
Валовая прибыль	030	8 856	11 758
Управленческие расходы	040	(659)	(562)
Расходы на реализацию	050	-	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	060	8 197	11 196
Прочие доходы по текущей деятельности	070	34 297	4 998
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(33 337)	(3 608)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090	9 157	12 586
Доходы по инвестиционной деятельности	100	67 270	11 526
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	66 804	9 389
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	5	7
проценты к получению	103	461	828
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	-	1 302
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(66 751)	(10 582)
в том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(66 745)	(9 369)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	(6)	(1 213)
Доходы по финансовой деятельности	120	43 901	5 348
в том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	43 845	5 314
прочие доходы по финансовой деятельности	122	56	34
Расходы по финансовой деятельности	130	(19 334)	(18 192)
в том числе:			
проценты к уплате	131	(5 934)	(7 553)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(13 376)	(10 611)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(24)	(28)

Наименование показателей	Код строки	За 2017 года	За 2016 года
1	2	3	4
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	140	25 086	(11 900)
Прибыль (убыток) до налогообложения	150	34 243	686
Налог на прибыль	160	(982)	(123)
Изменение отложенных налоговых активов	170	(1)	1
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	(5 152)	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	-
Чистая прибыль (убыток)	210	28 108	564
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	(58)	2
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток)	240	28 050	566
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	19	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

Руководитель Д. С. Янчук

Главный бухгалтер Т. А. Микулич

20 февраля 2018 г.

